БЕЛАРУСКАЯ МАЛАДЗЁЖНАЯ ГАЗЕТА

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

30 красавіка 1994 г.
Субота
№ 46(13763)
Кошт у розніцу 100 рублёў
Выдаецца з 1921 года

У НУМАРЫ:

"КІДОК НА ПОЎДЗЕНЬ" УЛАДЗІМІРА ЖЫРЫНОЎСКАГА. 2

☐ *Асобы выпадак.* СВАВОЛЬНІКІ З "ПСІХУШКІ". 2

☐ *Інтым-клуб.* ПРА ГЭТА НЕ ГАВОРАЦЬ... 3

☐ *Для вас, фаны!* ГІТ-ПАРАД "ЧЗ". 3

Малюе Віктар ДУБОВІК



Паважаныя суайчыннікі!

1 мая мы адзначаем свята працы.

Нашаму народу блізкія і зразумелыя гэтыя словы: мір, праца, май.

Для шчаслівай будучыні чалавецтва, дабрабыту і моцы нашай дзяржавы неабходныя перш за ўсё спакой на зямлі і добрасумленная праца кожнага з нас.

У гэты святочны дзень выказваю сардэчную падзяку рабочым, земляробам, інтэлігенцыі, усім, хто сваімі паўсядзённымі справамі ўносіць важкі ўклад ва ўмацаванне Рэспублікі Беларусь.

Шчыра віншую ўсіх вас, паважаныя суайчыннікі, са святам, жадаю добрага здароўя, шчасця і поспехаў на карысць нашай Бацькаўшчыны.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь М.ГРЫБ.

Кур'ер "ЧЗ"

Хто лепшы "спрынтэр" ?

Прэзідэнцкі спрынт набірае скорасныя абароты, прадстаўнікі дзевятнаццаці ініцыятыўных груп працягваюць збор подпісаў у падтрымку абвешчаных кандыдатаў. Першы тыдзень, паводле ацэнкі экспертаў, не прынёс ніякіх сенсацыйных навін.

Як стала вядома, толькі за тры дні было сабрана 90.000 подпісаў грамадзян, якія вырашылі падтрымаць прэм'ер-міністра Вячаслава Кебіча. Практычна не ўсёй тэрыторыі рэспублікі кампанія па збору подпісаў "за Кебіча" праходзіць вельмі арганізавана. Хаця, трэба зазначыць, розныя ініцыятыўныя групы літаральна з кожным днём актывізуюць сваю дзейнасць і, бадай, упэўнены ў канчатковым поспеху. Другі папулярны палітык экс-спікер парламента Станіслаў Шушкевіч пакуль (па колькасці сабраных подпісаў) адстае ад яўнага фаварыта.

Лукашэнка абвяргае

Набыўшы шырокую вядомасць і папулярнасць у народзе "антыкарупцыянер" народны дэпутат Беларусі Аляксандр Лукашэнка, адзін з прэтэндэнтаў на прэзідэнцкае крэсла, сутыкнуўся з першкодай на сваім шляху да палітычнага Алімпа.

У друку з'явіліся паведамленні, якія на думку Лукашэнкі, скажаюць ягоную пазіцыю наконт развіцця беларуска-расійскіх сувязей, у прыватнасці, пагаднення аб аб'яднанні грашовых сістэм дзвюх дзяржаў.

З гэтай нагоды Аляксандр Лукашэнка зрабіў заяву, у якой назваў падобныя меркаванні "хлуснёй і інсінуацыяй". Ён падкрэсліў, што яшчэ ў верасні мінулага года выказваўся за інтэграцыю Беларусі і Расіі, але за такую эканамічную інтэграцыю, якая стала б рэальнай, а не папяровай.

Якаў ЯСЭПКІН.

Сімпозіум у імя здароўя

Заўтра ў Мінску завершыцца IV нямецка-швейцарска-аўстрыйска-беларускі сімпозіум па праблемах дзіцячай анка-гематалогіі.

На працягу некалькіх дзён вядучыя спецыялісты вышэй упамянутых еўрапейскіх краін абменьваліся думкамі і меркаваннямі па актуальных праблемах дзіцячай гематалогіі і анкалогіі, выніках лячэння лейкеміі. Акрамя таго, упершыню ў СНД у рамках сімпозіума прайшла першая канферэнцыя медыцынскіх сясцёр па пытаннях дзіцячай анкагематалогіі. На сустрэчы закладзены пачатак будаўніцтва новага дзіцячага анкагематалагічнага цэнтра.

Святлана КУЛІКОВА.

"МММ" у беларускім варыянце?

У нацыянальным прэс-цэнтры Рэспублікі Беларусь адбылася сустрэча журналістаў з вядомым беларускім прадпрымальнікам Андрэем Клімавым.

"Нашы суайчыннікі,— сказаў ён, — атрымалі магчымасць мець сродкі на такое жыццё, якім жывуць у цывілізаваных краінах Еўропы. Для гэтага ёсць розныя варыянты дзейнасці. Мы прыйшлі да высновы, што лепшы спосаб атрымаць максімальны даход ад сваёй дзейнасці — гэта аб'яднанне сродкаў для іх выкарыстання ў рэалізацыі перспектыўных праграм, у прыватнасці — будаўніцтва жылля. Менавіта з гэтай мэтай і ствараецца наша акцыянернае таварыства".

Першапачатковы статутны фонд акцыянернага таварыства "Андрэй Клімаў" вызначаны ў 10 мільярдаў рублёў. На дадзены момант прададзена акцый на 9 мільярдаў. Сярод акцыянераў, падкрэсліў Андрэй Клімаў, акрамя юрыдычных асоб, прадстаўнікі сярэдніх слаёў грамадства, пакет акцый якіх складае ў сярэднім 500 тысяч рублёў.

БЕЛІНФАРМ.

Прысвечана году сям'і

1994 год аб'яўлены Генеральнай Асамблеяй ААН годам сям'і. У наш час бацькі сутыкаюцца з вялікімі цяжкасцямі: у што апрануць, абуць, чым накарміць дзяцей, як іх вывучыць і вылечыць. Пра ўсё гэта гаварылася на вечарыне бацькоў, якая адбылася ў Цэнтральнай гарадской бібліятэцы Маладзечна.

Тут арганізавана выстава "Святло сямейнага ачага", на якой прадстаўлена літаратура на тэмы сямейнага выхавання, побыту. Дзяцей на вечарыне чакала пацяшальная праграма.

Мікола КАПЫЛОВІЧ.

Новая ініцыятыва

Пазтычная акцыя "Новая ініцыятыва", якая днямі адбылася ў Віцебску, сапраўды насіла характар наватарскі, бо стала, што называецца, "першай ластаўкай" у развіцці нетрадыцыйных формаў пазтычнага мастацтва.

Таварыства вольных літаратараў, якое выступіла ў якасці арганізатара акцыі, апошнім часам вельмі пра гэта дбае. Тым больш гэта сімвалічна, бо наблізаецца гадавіна з дня заснавання ТВЛ. У бліжэйшы час адбудуцца новыя пазтычныя выступы — ужо ў Полацку, Наваполацку. А вяртаючыся да "Новай ініцыятывы", зазначу, што ўсё, што задумвалася, адбылося ў доме-майстэрні беларускага мастака Алеся Пушкіна. Ініцыятыўную групу ў той вечар складалі Алесь Аркуш, Славамір Адамовіч, Сяржук Мінскевіч, Алесь Туровіч і Сяргей Патаранскі, якіх віталі вельмі цёпла віцябчане, а іх у той вечар сабралася нямала.

Наступная імпрэза ТВЛ адбудзецца 8 мая і прадугледжвае рок-канцэрт, пазтычную вечарыну, выставы твораў выяўленчага мастацтва.

Сяржук ЖЫГІМОНТАЎ.

Усплёск злачынасці

У пачатку бягучага года ў Беларусі зафіксаваны новы рэзкі ўсплёск злачынасці.

У першым квартале было зарэгістравана 27,5 тысячы злачынстваў, што на 14,8 працэнта больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Асабліва рэзка (на 15,6 працэнта) павысілася колькасць разбойных нападаў, а таксама злачынстваў у сферы эканомікі. Разам з тым крыху зменшылася колькасць некаторых відаў цяжкіх злачынстваў: забойстваў, згвалтаванняў і нанясенняў цяжкіх цялесных пашкоджанняў. На 2,2 працэнта павысілася выкрыццё злачынстваў.

"ДДТ" у Мінску

Легендарная рок-група "ДДТ" рыхтуецца выступіць у Мінску з адзіным канцэртам. Ён адбудзецца 24 мая на стадыёне "Дынамо".

Як паведамілі арганізатары гэтага шоу, музыканты з Санкт-Пецярбурга прыедуць у Беларусь па запрашэнню ўрада рэспублікі. На гэты раз "ДДТ" выступіць са сваёй новай праграмай пад назвай "Гэта ўсё...". Мінск будзе месцам яе трэцяга паказу пасля прэм'еры ў дзвюх расійскіх сталіцах. Потым той жа канцэрт убачаць кіяўляне.

БЕЛІНФАРМ.

Курсы валют на 29 красавіка:

	Даляр ЗША		Нім. марка	
	Скупка	Продаж	Скупка	Продаж
"Комплекс"	15200	15750	9000	9370
"Пошук"	15150	15700	8700	9200
"Прыор"	15500	15700	9200	9300

Велікоднае пасланне Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі

Христос воскресе, смерць поправый,

и мертвыя воздвигнувый, людие, веселитеся.

(Велікодны канон, спеў 8).

Узлюбленыя ў госпадзе прасвяшчэнныя архіпастыры, пастыры, богалюбныя інакі і інакіні і ўсе верныя чады беларускай праваслаўнай царквы!

З вялікай радасцю віншую вас са святам святаў — днём святога Вялікадня!

У гэтую дзіўную ноч мы зноў успамінаем аб падзеі, якая па свайму значэнню не параўнальная ні з чым. Роўных ёй няма ў гісторыі чалавечага роду, бо яна з'яўляецца цэнтрам гісторыі, яе сувязным звяном, без якога ўсё, што адбываецца, страчвае сэнс. Гэтая падзея — уваскрэсенне Госпада нашага і збавіцеля Ісуса Хрыста. Святкуючы яго сёння, мы разам з царквою пяем: "Христос воскресе из мертвых, смертию смерть поправ и сущим во гробех живот даровав!"

Якая радасць павінна быць у нашых сэрцах пры ўспаміне аб уваскрэсенні Хрыстовым! Гэта — наша агульнае свята, наша агульная ўрачыстасць, бо ўсіх нас раней ці пазней чакае смерць... І вось, аказваецца, што яе няма, што яна пераможна. І мы можам разам з прарокам Асіяй усклікнуць: "Смерть! Где твое жало? Где твоя победа?" (13,14). Ад гэтых словаў сэрцы ўсіх напаўняюцца незямной радасцю, бо ўваскрэсеннем Хрыстовым ісцінна пераадолены цемра, марота і безнадзейнасць смерці.

Сапраўды, свяшчэнная і вартая радасці гэтая ратавальная і прамяністая ноч, у якую беспачатковае свята ў плоці прагляла ўсім з труны. Ці можа хто змерыць глыбіню цяперашняй радасці? Колькі прайшло стагоддзяў пасля ўваскрэсення Хрыстовага, колькі змянілася пакаленняў, народаў і звычаяў, але гэтая свяшчэнная радасць заўжды аднолькава чыстая і невымоўная, яна безмерна пераўзыходзіць усе зямныя радасці.

Велікодны канон абвяшчае гэтую радасць так: "Небеса убо достойно да веселятся, земля же да радуется, да празднует же мир, видимый же весь и невидимый: Христос бо восста веселие вечное" (спеў 7).

Гэтая радасць зямлі і неба вынікае ад усведамлення таго, што Хрыстос сышоў у апраметную пекла, ззяннем свайго бажаства скрышыў вечныя заклепы, што затрымлівалі там вязняў, і даў пераможную сваю зброю супраць усіх сіл пекла — жыватворны крыж!

З труны ўваскрэслага Госпада занялася зара ўсеагульнага ўваскрэсення: "...Ибо как во Адаме все умирают, так во Христе все оживут" (1 кар. 15,54). Не страшная цяпер і магіла, бо "поглощена смерть победой" (1 кар. 15,54), а яна ўчынілася ціхім пераходам да лепшага жыцця. Не абцяжарвае ўжо з набліжэннем да труны смутак адчаю, бо яснае сонца праўды сваімі найсвятлейшымі промнямі азарыла змрочны канец нашага зямнога шляху.

Радуецца сёння грэшнік, бо з труны жыццядайніка праззяў дар Божы уседаравання, усынаўлення і далучэння да жыцця вечнага!

Радуецца сёння пакутнік, бо з труны ўваскрэсла суцяшэнне ў пакутах, прыстанак і сіла ў журботах.

Радуецца сёння бядняк, бо з труны адкрыты шлях да вечных даброт, якіх ні сэрца не можа адчуць, ні розум не можа ахапіць.

Радуецца сёння з радасцю нашай і неразумнае стварэнне, бо і яно атрымала залог новага, лепшага жыцця.

Узлюбленыя! Сёння ўсе аднолькава зазнаюць духоўную радасць: і тыя, хто ведае пісанні, і хто не ведае, вучоныя багасловы і невучоныя прасцякі, і нават маладасведчаныя отракі — апошнія, пры тым, не менш, калі не больш за першых. Хто ж і што ўчыняе гэты дзівосны ўсеагульны радасны настрой? — невідочная радасць, таямнічая прысутнасць на зямлі самога ўваскрэслага Госпада, які пажадаў, каб ніхто з нас не быў у журботе і смутку.

І калі ён, па сваім боскім і найсалодшым голасе, з намі абяцаўся быць да сканчэння веку, тым болей знаходзіцца з намі ў цяперашнія дні яго праслаўлення і перамогі над пеклам і смерцю!

Але як некалі ён пры дзвярах зачыненых з'явіўся смуткуючым апосталам і даў ім мір, і як смуткуючым міраносіцам, прамовіў: "Радуйцеся!" і гэтымі жыватворнымі словамі напоўніў невыславенную радасцю сэрцы іх, так ён, найсалодшы выратавальнік наш, у гэтыя свяшчэнныя і ратавальныя дні нябачна знаходзіцца сярод нас і таямніча спавядае нам мір і радасць.

Праваслаўныя! Гэтая свяшчэнная ноч ёсць прадвесніца прамяістага дня ўсеагульнага, уваскрэсення, пачатак будучай бясконцай нябеснае радасці, бо што яўляюць сабой нашы праваслаўныя храмы са сваімі благалепнымі аздобамі! і свяшчэннадзеяннямі, як не самое неба і таямнічую прысутнасць тут нябесных сіл?

Што прадвяшчае сабой няспанне ў гэтую ратавальную ноч, гэтыя незмоўныя славаслоўі і хваласпевы ўваскрэсламу выратавальніку, гэтыя частыя яўленні сярод нас, свяшчэннаслужыцеляў у бліскучых адзеннях, гэтае наша прадстаянне прастолаў алтара пры адчыненай царскай брамі,— як не тую светлую і нескончальную раніцу, калі веруючы народ разам з анёламі і ўсім нябесным стварэннем будзе прадстаяць прастолу Божае славы, пакланяцца цару вякоў, які там увасядае, і нязмоўчна ўвасслаўляць яму славу і гонар (Апак.19, 1-7).

А што прадвяшчае сабой гэты заклік святой царквы да адной толькі духоўнае радасці і весялосці, без усялякага напаміну пра нашы грахі і недахопы, і гэтае запрашэнне ўсіх нас, без выключэння, да ўзаемнага даравання і сяброўскага прывітання,— як не той расійскі стан, калі "не будет ни плача, ни вопля, ни болезни" (Апак.21, 4), калі не будзе ні злахітрасці, ні ілжы, ні падману, ні нянавісці, ні варожасці, ні злосці, але будзе сярод верных адна найчысцейшая любоў і будуць "все одно во Христе Иисусе" (Гал.3, 28).

Таму, узлюбленыя, у гэты слаўны дзень і гэтую прамяністую ноч уваскрэсення Хрыстовага святая царква запрашае нас да аднаго духоўнага захаплення і незвычайнай радасці, каб яшчэ тут, на зямлі, далучыцца боскай весялосці царства Хрыстовага (Велікодны канон, спеў 8).

Свяціся, свяціся, новы Іерусаліме — царква божая! Радуйся сёння і весяліся, душа хрысціянская! Цешся святлом боскім, што агарнула цябе ў гэтую свяшчэнную ноч! Не адводзь поглядаў тваіх з віноўніка сённяшняй радасці — уваскрэслага выратавальніка твайго, нясі яму пераможныя спевы і пацвердзі вернасць яму справамі міласэрнасці і любові!

Дарагая паства праваслаўная! Не азмрочым жа мы светлых дзён учынімі цемры! Будзем імкнуцца да духоўных вышынь, на якія ўзяла нас святая царква, і чакаць, калі нябесныя анёлы і мы, зямныя вандроўнікі, разам збярэмся ў доме Айца нябеснага вечна святкаваць Вялікдзень божы ратавальны! Амінь!

Христос уваскрэсе!

Ісцінна ўваскрэсе!

Філарэт, Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

Дарагія ветэраны працы! Паважаны беларускі народ! Суайчыннікі!

Стала добрай традыцыяй ва ўсіх краінах свету і ў нас на Беларусі першы дзень веснавога месяца – мая – адзначаць як свята працы, свята працоўнага чалавека.

Веліч чалавека неад'емная ад самой яго працоўнай прыроды, паколькі праца з'яўляецца крыніцай і захавальніцай жыцця на Зямлі. Усё накопленае чалавецтвам, працавітымі людзьмі чацвертай рэспублікі, створана розумам і працай многіх пакаленняў.

Без стваральнай працоўнай дзейнасці людзей няма велічы дзяржаў і дабрабыту народаў. Гэта добра разумелі нашы ветэраны, калі ўзнімалі з пасляваенных руін гарады і вёскі рэспублікі, адраджаючы жыццё ў жылых дамах і вытворчых карпусах. Гэта вашай працай і творчасцю, дарагія ветэраны, створана ўсё тое, што складае набытак краіны.

Ваша нялёгкае жыццё ва ўмовах эканамічнага крызісу – дрэнная падзяка за сумленную чалавечую працу, якая аддадзена свайму народу. Урад разумее ўсю адказнасць перад вамі і будзе рабіць усё магчымае, каб змякчыць нашіх крызісу на ваш матэрыяльны і маральны стан. Прыміце мае віншаванні са святам 1-га Мая і шчырыя пажаданні моцнага здароўя і ўпэўненасці ў надзеях, што тыя, хто рыхтуе сябе да працоўнага шляху на школьнай лаўцы і ў студэнцкай аўдыторыі, цэняць тыя даброты, якія вамі створаны для іх, прадоўжаць лепшыя традыцыі, набытыя старэйшымі пакаленнямі нашага народа.

Умовы для працы ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, навуковым асяроддзі цяпер не зусім спрыяльныя. На матэрыяльным і духоўным стане людзей, іх сацыяльным становішчы адбіваецца крызісная эканамічная сітуацыя, якая паразіла ў першую чаргу вытворчасць – аснову атрымання жыццёвых даброт. Але крызіс не вечны. Выхад з яго залежыць ад нашых сумесных намаганняў. Гэта разумеем не толькі мы, але і нашы суседзі.

Невыпадкова доўгія месяцы ўрад па даручэнню Вярхоўнага Савета рэспублікі сумесна з урадам Расійскай Федэрацыі працавалі над заключэннем дагавора па эканамічнаму аб'яднанню нашых дзяржаў. Галоўнае ў дагаворы – стварэнне чалавеку ўмоў і гарантый працы, яе дастойнага ўзнагароджання. Упэўнены, што працоўны народ рэспублікі разумее і падтрымлівае рух да адзінства беларускага і расійскага народаў, якое ажыццяўляецца ў іх узаемных інтарэсах.

У гэтым годзе свята Дзень працы супала са святам Вялікадня. Пад гэтым добрым знакам я віншую ўсіх веруючых праваслаўнай царквы з Днём святога ўваскрэсення, што ўзасабляе веру ў жыццё, усяляе ў сэрцы людзей надзею на лепшую будучыню цяперашняга пакалення і іншых нашчадкаў.

Са святам працы вас, дарагія суайчыннікі, здароўя, шчасця і надзеі на лепшую будучыню, жыццё, дастойнае працоўнага чалавека.

Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В.Кебіч.

ВЕСТКІ З ПАРЛАМЕНТА

Кампраміс не атрымаўся

☐ **Вольга ШАЎКО, "ЧЗ"**

Нечарговая сесія Вярхоўнага Савета завяршылася ў рэкордна сціслы тэрмін з прыняццем (час пакажа наколькі важных) рашэнняў. Упершыню ў рэспубліцы абраны члены Канстытуцыйнага суда, якія прысягнулі на вернасць Асноўнаму Закону, а таксама былі ўнесены змяненні ў шэраг заканадаўчых актаў, што маюць на ўвазе хутчэйшы рух да рублёвай зоны.

Галасаванне па апошняму пытанню далося дэпутатам з цяжкасцю. Усяго некалькі галасоў вызначыла яго вынікі на карысць уз'яднання з Расіяй. Спрабуючы прымірыць палярныя думкі і зацерагчы рэспубліку ад магчымай небяспекі ў тым выпадку, калі дамоўленасці не запрацуюць, старшыня камісіі па пытаннях працы, цан, занятасці і сацыяльнай абароненасці насельніцтва Аляксандр Сасноў унёс на разгляд сесіі альтэрнатыўны варыянт пастановы. У ім прапаноўвалася не адмяняць законы, а толькі часова прыпыніць іх дзеянне. Аднак, большасць на такі кампраміс не пайшла. Зрэшты, паводле слоў самога Аляксандра Віктаравіча, ён не вельмі і разлічваў на падтрымку. Навошта ж тады ўносіўся гэты праект? Па тлумачэнні мы звярнуліся да самога дэпутата.

Аляксандр Сасноў:

— Мне неабходна было атрымаць слова, каб агучыць свае сумненні, паказаць, што многія разлікі экспертаў падманлівыя. Гэтай мэты я дабіўся. У прыватнасці, я сказаў аб той небяспецы, якая нас чакае ў сувязі з аб'яднаннем грашовых сістэм.

Напрыклад, незразумела, які курс абмену будзе па заработнай плаце? Калі яе мяняць адзін да аднаго, то сярэдняя зарплата ў нашай рэспубліцы складзе 250 тысяч расійскіх рублёў. У саміх жа расіян — 150—160 тысяч. Зразумела, на гэта Расія ніколі не пойдзе. Калі ж абмен адбудзецца па бягучаму рыначнаму курсу, то сярэдняя зарплата нашых людзей будзе 25—35 тысяч расійскіх рублёў. А пенсіянеры ўвогуле атрымаюць 15—20 тысяч. Гэта крах для ўсіх, прамы шлях да збяднення народа. Можна дапусціць, што будзе прапанаваны якісьці, не вельмі прыгнятальны, ашчадны курс для пераліку зарплаты нашых прадпрыемстваў. Але ў такім выпадку рэзка павысіцца сабекошт іх прадукцыі за кошт уключэння гэтай зарплаты ў затраты. Сёння нашы прадпрыемствы і так не могуць прадаць сваю прадукцыю ў Расію, а калі кошт падскочыць яшчэ, — тым больш не змогуць.

І яшчэ. А што будзе, калі Расія не выканае свае дагаворныя абавязацельствы, як ужо часта гэта рабілася? Адмяніўшы свае заканадаўчыя акты зараз, мы потым ужо нічога не зможам зрабіць. Таму я і прапанаваў толькі спыніць іх дзеянне, тым больш, што такім крокам мы нічым не перашкаджалі б рабоце Савета Міністраў у гэтым напрамку.

А калі сумленна, то я лічу, што большасць дэпутатаў, прагаласаваўшых за адмену законаў, не ідуць у рублёвую зону. Яны хочуць стварыць пэўны імідж кандыдату ў прэзідэнты пад час выбарчай кампаніі. Сам я перакананы, што дагавор аб аб'яднанні грашовых сістэм дзейнічаць не будзе, і на яго забудуцца пасля прэзідэнцкіх выбараў.

Такая думка аднаго з дэпутатаў. Час пакажа, ці меў ён рацыю. Відавочна, як сёння і ў грамадстве, так і ў вышэйшым заканадаўчым органе рэспублікі не можа быць аднолькавых меркаванняў. Сумненні яшчэ доўгі час будуць праследаваць нас на шляху да эканамічных пераўтварэнняў і ў час палітычных рознагалоссяў.

"Еўраньюс" — "Суперчэннэл" — "Уорлднэт" — "TV-5"

ДЗЕВЯТАЕ НЕБА

Дзяжурны па выпуску — Я.ЯСЭПКІН.

Дванаццаць, але не апосталаў

Паліцыя Калумбіі арыштавала дванаццаць чалавек, якія займаліся вырабам і збытам гераіну.

Аперацыя была праведзена непадалёку ад горада Рыафрыа ў правінцыі Таліма. Знішчана плантацыя маку, захоплены лабараторыя па вырабу наркотыкаў, а таксама вялікая колькасць зброі.

Замест свята – сесія

Першамайская дэманстрацыя ў гэтым годзе не будзе праводзіцца ў кубінскай сталіцы "па эканамічных меркаваннях", паведаміў генеральны сакратар прафцэнтра працоўных Кубы П.Рос.

"Дэманстрацыя каштуе вельмі дорага, і краіна не можа сабе дазволіць такую раскошу", — падкрэсліў ён. Першамай на Кубе вырашана адзначыць адкрыццём нечарговай сесіі нацыянальнай асамблеі народнай улады (парламента).

Можна назіраць, пробы нельга браць

Па паведамленнях інфармацыйных агенцтваў, Паўночная Карэя дазволіць назіральнікам з МАГАТЭ прысутнічаць пры замене паліўных шпянёў на сваім ядзерным рэактары, аднак не дазволіць ім узяць пробы адпрацаванага паліва.

Такія пробы неабходны для таго, каб вызначыць, ці не выкарыстоўваліся ядзерныя матэрыялы ў ваеннай праграме.

Амерыканскія аўто ў Каіры

Першая партыя патрыманых аўтамабіляў, якія Злучаныя Штаты ахвяравалі Арганізацыі вызвалення Палесціны для стварэння паліцэйскіх сіл на аўтаномных тэрыторыях, даставлена ў Каір.

Па словах дзяржсакратара ЗША Уорэна Крыстафера, ён спадзяецца, што ахвяраванне дапаможа стварыць жыццяздольныя паліцэйскія сілы для падтрымкі парадку на аўтаномных тэрыторыях. Усяго Вашынгтон плануе паставіць 200 аўтамабіляў.

Ультыматум ... шокатэрапіі

У Польшчы — новы вал страйкаў. Услед за шахтамі бурага вугалю спыняюцца электрастанцыі і прамысловыя прадпрыемствы.

Страйкавы рух арганізаваны "Салідарнасцю". Яе лідэр Мар'ян Кшаклеўскі настойвае: баставаць да поўнай перамогі. Адно з галоўных патрабаванняў — павелічэнне заработнай платы і адмена ўсіх абмежаванняў на яе рост. Страйкі набываюць характар не толькі сацыяльнага, але і палітычнага ультыматуму. Паводле аўзнак мясцовай прасы, у Польшчы бастуюць не тыя, каму жывецца горш за ўсіх, а тыя, хто мацнейшы, у прыватнасці, шахцёры.

(Працяг на 3-ю стар.).

ПАВЕДАМЛЕННІ, АТРЫМАНЫЯ ПА КАНАЛАХ СПАДАРОЖНІКАВАЙ СУВЯЗІ "ЧЫРВОНАЙ ЗМЕНЫ"

БІЗНЕС-КЛАС

Вядучая рубрыкі Вера ПАЛЯКОВА
Тэл. 68-28-52

РЫНАК ПРАЦЫ

15446 чалавек — такі прырост колькасці беспрацоўных у Беларусі за тры месяцы бягучага года. Агульная колькасць беспрацоўных на ўліку органаў дзяржаўнай службы занятасці насельніцтва на пачатак красавіка дасягнула 81775 чалавек, а ўзровень беспрацоўя склаў 1,43 працэнта (напачатку года — 1,16 працэнта).

За тры месяцы ў органы службы занятасці насельніцтва за аказаннем дапамогі ў працаўладкаванні звярнуліся 49822 чалавекі. Атрымалі дапамогу 18906 чалавек, або 37,9 працэнта. Затраты на сацыяльную падтрымку незанятага насельніцтва з Фонду садзеяння занятасці склалі 4 млрд.635 млн.рублёў. Трэба адзначыць, што сітуацыя на рынках працы розных рэгіёнаў значна адрозніваецца. Найбольшы прырост колькасці беспрацоўных за першы квартал 1994 года зарэгістраваны па Гомельскай і Брэсцкай абласцях, а найменшы — у Мінску. Па ўзроўню беспрацоўя працаздольнага насельніцтва на першым месцы Мінская вобласць — 1,84 працэнта (горад Мінск — 0,98 працэнта).

Найменшая патрэба ў працоўнай сіле зафіксавана па Брэсцкай вобласці: на 1 красавіка ўсе прадпрыемствы і арганізацыі далі заяўкі толькі на 645 працаўнікоў (543 з іх — рабочыя спецыяльнасці). Найбольшы попыт на працоўную сілу ў Мінску — 4978 заявак. У астатніх рэгіёнах попыт вагаецца ад 1,5 да 2,5 тысячы.

ЧАС – ГРОШЫ

Агульнавядома, што зараз самы дарагі тавар — інфармацыя. А найдаражэйшы — інфармацыя, што трапляе да вас своечасова: хто не паспеў — той спазніўся. У першую чаргу гэта тычыцца бізнесменаў, бо без наяўнасці мабільных сродкаў сувязі нельга весці справы з поспехам. Паводле статыстычных даных Вашынгтонскага інстытута сацыялогіі, 90 працэнтаў амерыканскіх бізнесменаў зарабляюць грошы па тэлефоне.

На Захадзе зараз выкарыстоўваюцца ў асноўным тры тыпы мабільных сродкаў сувязі. Найбольш просты і танны — пейджэр. Паколькі большая частка тэлефонных размоў мае аднабаковы характар (аддаць загад або распараджэнне, папрасіць аб нечым ці прыгадаць сустрэчу), а ваш калега, падначалены знаходзіцца далёка ад тэлефона, лепш за ўсё карыстацца пейджэрам. Прынцып карыстання вельмі просты: трэба тэлефанаваць на перадатачную станцыю і перадаць аператару паведамленне. У любы час сутак абанент пачуе сігнал з маленькай пластмасавай скрыначкі, што трымаецца на ягоным поясе і, націснуўшы кнопку, прачытае тэкставае паведамленне, ці нумар тэлефона, умоўны гукавы сігнал.

Больш складаны від сувязі — мабільны тэлефон. Ён мае шэраг функцый і выкарыстоўваецца ў любых умовах. Яго можна падключыць да акумулятара аўтамабіля і размаўляць, не адрываючы рукі ад руля, можна паставіць у любым месцы, дзе ёсць разетка на 220V, апарат можна насіць у руках, тады ён можа працаваць на працягу 50 хвілін размовы. Зараднае прыстасаванне (220V) за ноч здабывае энергію ў акумулятары. Каштуе такі тэлефон 1050 даляраў.

Аднак найбольш дарагім, складаным і зручным сродкам сувязі з'яўляецца партатыўная радыёстанцыя. Яна дае магчымасць весці размову з адным і больш абанентамі, звязвацца з тэлефоннай сеткай, размаўляць, знаходзячыся ў значнай адлегласці ад горада, у аўтамабілі, на дачы, бо радыус дзеяння радыёстанцыі — 70 кіламетраў. Самая маленькая станцыя не больш за пачак цыгарэт. Кошт розных мадыфікацый радыёстанцый вагаецца ад 799 да 1500 даляраў.

І яшчэ. Агульнавядома, што вашы дзелавыя перагаворы па тэлефоне можа нехта падслухаць, што па зразумелых прычынах непажадана. Тут вам дапаможа скрэблер — прыстаўнае для кадзіравання і дэкадзіравання сігналаў. Яго можна ўманціраваць у радыёстанцыю, мабільны тэлефон і проста ў тэлефонны апарат. Зламыснік, што падключыўся да лініі, пачуе толькі трэск, а ваш абанент, які мае другі скрэблер, усё зразумее. Коды перадачы пасля кожнай размовы аўтаматычна мяняюцца, таму "вылічыць" сігнал практычна немагчыма.

ДАРЭЧЫ...

Паводле ацэнак урадавых экспертаў, напрыканцы бягучага года курс даляра ў Расіі падымецца да 4500 рублёў. Узровень інфляцыі, як чакаюць, у сярэднім будзе 11-13 працэнтаў у месяц, аднак, да снежня, паводле прагнозаў, ён знізіцца да 7-8 працэнтаў. Мяркуецца ўдвая ў параўнанні з мінулым годам паменшыць крэдытную эмісію, рэзка скараціць дзяржаўныя датацыі. Бюджэтны дэфіцыт дасягне 62 трыльёнаў рублёў.

"ПАС" — палітыка-аналітычная служба

Ці патрэбен беларусам "кідок на поўдзень"?

☐ Барыс САФРОНЕНКА

Калі паспрабаваць адным словам выказаць уражанне аб асобе і палітычным крэдо Уладзіміра Жырыноўскага, на розум прыходзіць толькі адно слова — "раптоўнасць". Неспадзяванае само яго з'яўленне на палітычнай арэне. Нечаканы стыль і змест галоўнай на сённяшні дзень кнігі Жырыноўскага "Апошні кідок на поўдзень".

Напэўна, нам, беларусам, будзе таксама варта азнаёміцца з поглядамі аўтара, які не апошняе месца займае сёння ў палітычным жыцці нашай суседкі Расіі, ды і геапалітычныя погляды яго так ці інакш закранаюць інтарэсы нашай рэспублікі, а пры ўкараненні іх у жыццё могуць крута змяніць яе лёс, прычым, не ў лепшы бок.

Уявім сабе, што Уладзімір Вольфавіч стане ўсё ж прэзідэнтам. Што ж ён прапануе ў гэтай якасці Расіі і свету?

А прапануе ён, мяркуючы па яго кнізе "Апошні кідок на поўдзень", стары як свет спосаб рашыць усе ўнутраныя і знешнія праблемы сваёй краіны шляхам бліцкрыгу, хуткага заваявальнага паходу расійскай арміі на поўдзень.

Уладзімір Вольфавіч малюе прыгожую, эмацыянальна прыўзнятую карціну будучага працвітання рускай нацыі і сумежных народаў пасля таго, як Расія заваюе Іран, Турцыю і Афганістан. Выйшаўшы на бераг Індыйскага акіяна, "мы знойдзем і спакойных суседзяў", гэта значыць дружалюбных Індыю і Ірак. Спыняцца ўсе міжнацыянальныя канфлікты, таму што ўсюды будуць стаяць рускія гарнізоны. Заваяваныя тэрыторыі падзелім на губерні, паветы, правінцыі, дарэчы, як і ўсю Расію і ўсе краіны СНД. Настане "змяшанне народаў у выніку агульнай эканомікі, панаванне рускай мовы, рускага рубля, галоўнае месца рускай арміі, як найбольш баяздольнай, так ужо гістарычна склалася". Будучыня заваяванага краю пасля гэтага пераможнага паходу ўяўляецца лідэру ЛДПР у такіх светлых фарбах, што падобна на утопію: "Трэба назаўсёды супакоіць гэты рэгіён, каб там, на берагах Індыйскага акіяна і Міжземнага мора, былі базы адпачынку, лагеры для моладзі, санаторыі, прафілакторыі. Увесь поўдзень мог бы стаць суцэльнай зонай санаторыяў, дамоў адпачынку для працы мысловай Поўначы і для людзей усіх нацыянальнасцей".

Дзіўна, але думка, якая напрошваецца сама сабой: а як быць з супраціўленнем туркаў, афганцаў і жыхароў Ірана? — Уладзімірам Вольфавічам не тое, што поўнасцю ігнаруецца, ён проста не лічыць яе важнай. Мала таго, дапускае, што такога супраціўлення, барацьбы за сваю незалежнасць можа і не быць. Яго аргументы на карысць такога парадаксальнага меркавання могуць выклікаць толькі ўсмешку. Жырыноўскі лічыць, што Афганістан супраціўляўся савецкім войскам толькі таму, што "з 1979 па 1989 год у Афганістане стаяла Чырвоная Армія пад камуністычнымі сцягамі. А калі б гэта была царская знешняя палітыка, усе пытанні былі б даўно ўжо вырашаны. Мае вялікае значэнне псіхалагічны фактар — хто менавіта ажыццяўляе тую ці іншую палітыку". Жырыноўскі ўпэўнены, што супраць царскіх войск афганцы не ваявалі б. Але ж больш дружалюбны ў адносінах да Расіі Каўказ царскія войскі ў XIX стагоддзі не маглі заваяваць на працягу 25 гадоў. Факт, які гуманітарый Жырыноўскі павінен бы ведаць. Калі прытрымлівацца яго логікі, незразумела, чаму наша насельніцтва ў Вялікую Айчынную не сустракала фашысцкія войскі з хлебам-соллю, бо яны ж не неслі з сабой камуністычных ідэй.

Пры азнаямленні з геапалітычнай праграмай Жырыноўскага абавязкова ўзнікае пытанне: а што ж у выпадку "апошняга кідка" Расіі на поўдзень" будуць рабіць іншыя вялікія дзяржавы свету? Спакойна назіраць за тым, што адбываецца? Дзіўна, але Уладзімір Вольфавіч недвухсэнсоўна, зусім сур'ёзна лічыць, што так, будуць спакойна назіраць. "Адзінай, каму б гэта магло не спадабацца, — Амерыцы, але яна не стане ўмешвацца, вельмі цяжкі іншы варыянт развіцця для яе, калі яна ўмяшаецца". На думку Жырыноўскага, каб ніхто не перашкаджаў Расіі ўстанаўліваць новыя межы на поўдні, патрэбна толькі "дамовіцца, што мы падзяляем усю планету (!), сферы эканамічнага ўплыву ў напрамку поўнач—поўдзень". Гэта значыць трэба ажыццявіць чарговы, ужо трэці ў гатым стагоддзі перадзел свету. Тое, што падобныя падзелы непазбежна вядуць да сусветных войнаў, лідэра ЛДПР зусім не хвалюе, ён проста стараецца не заўважаць такей заканамернасці. Затое дакладна, у стылі безагаворачных рэляцый палкаводца сваім генералам, указвае, якой з буйных дзяржаў чым менавіта належыць уладарыць: "Японцы і кітайцы — уніз, на Паўднёва-Усходнюю Азію, Філіпіны, Малайзію, Інданезію, Аўстралію. Расія — на поўдзень — Афганістан, Іран, Турцыя, Заходняя Еўропа — на поўдзень — афрыканскі кантынент. І, нарэшце, Канада і ЗША — на поўдзень — гэта ўся Лацінская Амерыка. І ўсё гэта на роўных. Тут няма ні ў кога пераваг, напрамак адзін і той жа — на поўдзень".

Застаецца толькі здзіўляцца, як гэта ЗША не паслухаліся раней Жырыноўскага і заявалі з яго сябрам Садамам Хусейнам, у той час як па геапалітычнай формуле лідэра ЛДПР ім трэба наводзіць парадак толькі і выключна ў Лацінскай Амерыцы. Дарэчы, Уладзімір Вольфавіч лічыць, што ЗША не будуць перашкаджаць яго заваявальным планам не толькі з-за таго, што ён, Жырыноўскі, паказаў ім, неразумным, куды трэба накіраваць сваю агрэсію, але і таму, што іх хутка чакае, што б вы думалі? Перабудова, што горш за любую чуму і вайну. Так і піша: "Напярэдадні ў вас — ваша перабудова, ваша хвароба, ваша дэградацыя. І мы, рускія, не будзем злараднічаць, калі нейкія штаты пачнуць адасабляцца, калі будуць спыняцца вашы заводы, калі вам не будзе хапаць прадуктаў харчавання, лекаў, калі будуць выязджаць з Амерыкі ў Еўропу, у Расію, у Японію, у ПАР, у Аўстралію. Мы не будзем злараднічаць, калі Каліфорнія адыдзе да Мексікі, калі ў Маямі будзе створана негрыцянская рэспубліка, калі рускія вернуць сабе Аляску".

Не ўпэўнены, што самая раскаваная фантазія самага вынаходлівага амерыканскага пісьменніка-фантаста магла б прыдумаць і хоць неяк абгрунтаваць падобную карціну будучага для сваёй краіны. Жырыноўскі абгрунтоўвае яе з лёгкасцю. Аказваецца, перабудова ў ЗША і іншыя беды адбудуцца з-за "экспансіі іспанамоўных з Мексікі, з іншых лацінскіх краін і размнажэння чорнага насельніцтва, якое можа дасягнуць 40—50 мільёнаў. Усё разам гэта ўжо складзе каля ста мільёнаў. Палова Амерыкі стане каляровай. І ў перспектыве, улічваючы, што каляровае насельніцтва размнажаецца хутчэй, у Амерыцы будзе далейшы рост злачынасці, гібель белага насельніцтва і ў той жа час размнажэнне каляровага. І хто ведае, ці не папросіць Амерыка дапамогі ў Расіі ў сярэдзіне XXI стагоддзя?" Паводле Жырыноўскага, Расія павінна дапамагчы і Францыі, "інакш сталіца Францыі да новага стагоддзя — да 2000 года — ператворыцца ў арабскі горад. Бо алжырцы паціху захопліваюць Парыж і ідуць далей. Еўропа мае патрэбу ў нашай дапамозе".

Такім чынам, паводле тэорыі лідэра ЛДПР, уся справа ў больш хуткім размнажэнні непаўнацэнных у расавых адносінах народаў. Адсюль і кроку не застаецца да абгрунтавання неабходнасці іх хутчэйшага знішчэння, хаця б і ў канцэнтрацыйных лагерах.

Асобна пра Беларусь у сваёй кнізе ён не гаворыць, загадзя разглядаючы яе як расійскую правінцыю. Прычым, такую правінцыю, якой Расіі зусім не шкада, якую яна настолькі не шануе, што частку яе тэрыторыі можа ўступіць іншым для рашэння сваіх геапалітычных задач. Вось пра гэта ў лідэра ЛДПР сказана недвухсэнсоўна: "Германія атрымае магчымасць аднавіць Усходнюю Прусію за кошт тэрыторыі Польшчы—часткі яе". Палякі ў такім выпадку, як справядліва думае Жырыноўскі, застануцца незадаволенымі, тым больш, што "яны (палякі) хацелі б атрымаць Львоў, але Львоў патрэбны Заходне-Украінскай рэспубліцы (які клопат!). І немцы паціснуць палякаў". І вось тут Уладзімір Вольфавіч мяркуе "ў раёне Брэста, напэўна, нешта і спадабаецца Польшчы". Такім чынам, паводле Жырыноўскага, Польшча можа быць узнагароджана за кошт Брэстчыны. Астатак жа Паўночна-Заходняга краю, або як там яшчэ Уладзімір Вольфавіч мае намер назваць былую Беларусь, павінен поўнасцю русіфікавацца. Пры гэтым больш за ўсё пацерпіць Народны фронт, таму што лідэр ЛДПР заявіў у інтэрв'ю газеце "Известия": "Варта было б законам забараніць стварэнне і функцыяніраванне ўсіх арганізацый нацыяналістычнага сепаратысцкага кшталту, якія ставяць сваёй мэтай падзяленне СССР (інтэрв'ю давалася праз два гады (!) пасля распаду Саюза), усе гэтыя народныя франты".

Наогул Жырыноўскі не тое што не лічыць магчымым існаванне нацыянальных звычаяў, культур, моў. Чаму ж ён, напрыклад, думае нават захаваць дваяжэнства ў Азіі, качавы спосаб жыцця для народаў, якія жывуць у юртах. Можна, значыць, спадзявацца, што, прыйшоўшы да ўлады і атрымаўшы Беларусь у якасці губерні Расіі, ён беларускія звычаі і фальклор пакіне. Але гэта зусім не значыць, што будзе шанаваць беларускую культуру. Вось ужо гэта нізашто! У гэтым плане спадар Жырыноўскі цвёрды "На гэтай новай прасторы,— запэўнівае ён,— да берага Індыйскага акіяна ўсе будуць размаўляць па-руску. Дзесяткі розных народаў, розныя веравызнанні, цюркамоўныя і фарсімоўныя, славяне і грэкі, курды і арабы". Наогул, хочаце развівайце сваю нацыянальную культуру за свой кошт, але ніяк не дзяржаўну. І не дай вам Бог, калі нацыянальная мова, нацыянальная культура набудзе прыярытэт над расійскай мовай і культурай. Адразу ж абвінавацяць у нацыянальным сепаратызме з усімі вынікамі.

Калі працэс пераходу Беларусі ў рублёвую зону будзе пашырацца, паглыбляцца і ў рэшце рэшт закончыцца поўным эканамічным і палітычным уваходжаннем Беларусі ў склад Расіі (а гэтага не яўна, дык тайна жадаюць многія народныя дэпутаты, у якіх у крыві, ледзь не ў генах устаноўка: будаваць жыццё толькі па ўказанню Масквы), беларусам застанецца толькі спадзявацца, што пераможа разумны сэнс і да ўлады не прыйдзе ЛДПР.

Пурпуровае лісце

☐ Якаў ЯСЭПКІН

Мінае красавік, заўтра — май — вянец веснавога цвіцення прыроды. Росквіт залатой і вечна юнай пары, калі смарагдава-сонечная лістота дорыць усім радасць аднаўлення. Сёлетні май на Беларусі не зусім звычайны. Здаецца, прыродную квецень адцяняюць папяровы-электронным пурпурам промні палітычнага сонцастаяння. Гэтае палітычнае свяціла рушыць у зеніт, які ў часовым вымярэнні супадае з сонцастаяннем летнім. Чэрвень тоіць у сабе адказ на народнае спадзяванне аб адраджэнні.

У жыццё грамадства ўладарна ўваходзіць новая палітычная ява. Спачатку быў проста слоўны накат, бясконцыя меркаванні наконт прэзідэнцтва. Пасля прыняцця адпаведных заканадаўчых актаў чорна-ліловыя літары амаль маланкава натуралізаваліся, шпарка ўвайшлі ў рэчаіснасць. Не паспелі азірнуцца — "прэзідэнцкая кавалькада" імчыць, апярэджваючы разважлівы час. Па-за яе кампактным каркасам — шэраг уяўных прэтэндэнтаў на "трон". Хто зойме прывілеяваныя месцы ў сталёвым купэ транзітнага экспрэса да прэзідэнцтва ўжо ў якасці рэальнага лідэра? Даведаемся даволі хутка (рэгістрацыя кандыдатаў, як вядома, мусіць адбыцца з 27 мая па 2 чэрвеня). Аднак сапраўдны адказ на далёка не рытарычнае пытанне даём мы з вамі менавіта цяпер, ставячы свае подпісы на сціплых паперах станоўчага ўзору.

З падпіснымі лістамі ў народ пайшлі прадстаўнікі ініцыятыўных груп. Іх дзевяноста-наццаць. Збор подпісаў распачаўся на гэтым тыдні, а менавіта — у панядзелак. Але ж усім зразумела, што прэтэндэнты часткі (і даволі вялікай) прэтэндэнтаў на лаўры беларускага Цэзара, як ні сумна, не маюць аніякай падставы. Хаця і сімвалічны ўдзел у кампаніі дае пэўныя дывідэнды (не зваліться, дык сярэбраныя ці нейкія яшчэ) усім, хто марыць аб узыходжанні на палітычны Алімп.

Важкімі выглядаюць дамаганні канкрэтных людзей. Іх імёны на слыху, і ўсе яны належаць да айчыннай палітычнай эліты, да сучаснага парламенцка-ўрадавага істэблішмента. Нават такіх палітыкаў "новай хвалі" як Пазьняк ці Лукашэнка можна з упэўненасцю адносіць да элітарнай групоўкі ў агульных шэрагах кандыдацкай раці, бо іх шырокая вядомасць, "свячэнне" у яркім бляску тэлевізійных сафітаў, пастаянная фізічная ці ўяўная прысутнасць у калідорах улады не патрабуюць дадатковага тлумачэння. Ці належным чынам выкарыстаюць яны "залатыя векселі" ўсенароднай вядомасці — вось у чым яшчэ адно пытанне.

І тут трэба прыгадаць нядаўні расійскі феномен, які ўразіў не толькі Расію, а і свет. Перамога, хай і Права, на апошніх парламенцкіх выбарах партыі Жырыноўскага стала "халодным душам" для спрачаўшыхся паміж сабою палітыкаў-волатаў. Зусім не гіганцкая фігура Уладзіміра Вольфавіча, павольна ўзнікшая спачатку на тэлеэкранах, пасля поспеху на выбарах не толькі пераскочыла электронны бар'ер, але і вырасла ў памерах. Гэта не цуды звышрэальнасці, а заканамерны вынік пісьменна праведзенай агітацыі. Выкананне абяцанкаў — другарадна, галоўнае ў тым, каб дасягнуць мэты. Прыклад тым больш актуальны, калі ўлічыць апублікаваную на днях пастанову беларускага ўрада і Цэнтрвыбаркама аб парадку карыстання кандыдатамі ў прэзідэнты сродкамі масавай інфармацыі. Для ўсіх ствараюцца роўныя ўмовы, толькі ад розуму і таленту нашых прамоўцаў будзе залежаць іх поспех ці правал. Вядома, у агітацыйным буме пераважае элемент гульні на публіку, але ёсць правілы, абумоўленыя самой сутнасцю выбараў. Што адбудзецца пасля іх, ці стане смак рэформ больш салодкім для народа, — цяпер не скажа ніхто.

Цяпер разгортваецца нежартоўная барацьба за электарат, напал і градус яе ўзрастаюць разам з тэмпературай майскага паветра. Да сярэдзіны месяца працягнецца збор подпісаў. Потым лісты з прозвішчамі складуцца ў пухлыя фаліянты, а затым адыдуць у гісторыю. З антычных часоў пурпур — колер улады, таму для кагосьці яны стануць пурпуровым лісцем, сімвалізуючым перамогу. Пазней хто-небудзь зможа і ўплесці іх у лаўровы вянок трыумфатара. Для астатніх жа падпісныя паперы ператворацца ў апалае лісце.

ПАСТАНОВА

Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і Цэнтральнай камісіі па выбарах прэзідэнта

"Аб парадку карыстання кандыдатамі ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь сродкамі масавай інфармацыі"

У адпаведнасці з артыкулам 8 Пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 30 сакавіка 1994 г. "Аб правядзенні выбараў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь" і выходзячы з таго, што кандыдаты ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь з часу іх рэгістрацыі Цэнтральнай камісіяй па выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь удзельнічаюць у выбарчай кампаніі на роўных пачатках, маюць аднолькавае права на карыстанне сродкамі масавай інфармацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь і Цэнтральная камісія па выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь п а с т а н а ў л я ю ц ь:

1. Сродкі масавай інфармацыі, адным з заснавальнікаў якіх выступаюць дзяржаўныя органы, арганізацыі, установы, а таксама сродкі масавай інфармацыі, што часткова фінансуюцца за кошт дзяржаўных сродкаў, абавязаны забяспечваць роўныя магчымасці для перадвыбарных выступленняў кандыдатаў у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

2. Кандыдаты ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь з часу іх рэгістрацыі маюць права апублікаваць у рэспубліканскіх, абласных і мінскай гарадской газетах сваю перадвыбарную праграму аб'ёмам 1/2 паласы фармату А-2, у гарадскіх, раённых і аб'яднаных газетах — 1/2 паласы фармату А-3. Тэксты ўказаных праграм павінны быць прадстаўлены ў рэдакцыі газет не пазней чым за 15 дзён да выбараў. Пры апублікаванні гэтых праграм захоўваецца чарговасць іх паступлення.

3. Кандыдаты ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь з часу іх рэгістрацыі маюць права бясплатна выступаць па дзяржаўнаму тэлебачанні і радыёвяшчанні.

Ліміт часу ў разліку на аднаго кандыдата ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь складае 2,5 гадзіны на рэспубліканскім тэлебачанні, 2,5 гадзіны на рэспубліканскім радыё і прадастаўляецца на аднолькавых падставах у вызначаны час. Графік выступленняў кандыдатаў у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь па рэспубліканскаму тэлебачанні і радыёвяшчанні зацвярджаецца Дзяржаўным камітэтам па тэлебачанні і радыёвяшчанні па ўзгадненню з Цэнтральнай камісіяй па выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Працягласць часу вяшчання, які даецца кандыдату ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, не можа быць меншай чым 30 мінут, а колькасць выступленняў — не менш чым два. Пры гэтым, у выпадку выступлення па тэлебачанні павінен фіксавацца час, а перад пачаткам і пасля заканчэння выступленя па радыё дыктар павінен паведаміць дакладны час.

Ліміт прадастаўлення часу вяшчання кандыдатам у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь на мясцовым тэлебачанні і радыёвяшчанні, а таксама працягласць іх выступленняў устанаўліваюцца Дзяржаўным камітэтам па тэлебачанні і радыёвяшчанні.

4. Падставай для прадастаўлення эфірнага часу кандыдату ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь з'яўляецца пасведчанне кандыдата ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь і яго пісьмовая просьба кіраўніцтву Дзяржаўнага камітэта па тэлебачанні і радыёвяшчанні, якая падаецца кандыдатам у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь не пазней чым за 5 дзён да выступлення. Пры гэтым захоўваецца чарговасць прадастаўлення эфірнага часу, зыходзячы з часу паступлення пісьмовых просьбаў кандыдатаў у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

5. У межах прадастаўляемага часу вяшчання кандыдат у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь самастойна вызначае змест інфармацыі, звязанай з перадвыбарнай агітацыяй, і склад сваіх прадстаўнікоў (удзельнікаў), за выключэннем вядучага.

6. Тэле- і радыёперадачы з перадвыбарнымі выступленнямі ідуць у прамым эфіры з адначасовым відэа- і аўдыёзапісамі, якія захоўваюцца на працягу шасці месяцаў пасля выбрання прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

7. У выпадку адмовы кіраўніцтва Дзяржаўнага камітэта па тэлебачанні і радыёвяшчанні ў выдзяленні эфірнага часу кандыдату ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь на рэспубліканскім тэлебачанні і радыёвяшчанні, парушэння прынцыпу роўных умоў выдзялення эфірнага часу Цэнтральная камісія па выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь мае права патрабаваць ад Дзяржаўнага камітэта па тэлебачанні і радыёвяшчанні даць кандыдату ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь іншы гарантаваны эфірны час.

У выпадку зрыву перадачы па віне кандыдата ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь гэты эфірны час залічваецца ў агульны аб'ём эфірнага часу, які выдзелены канкрэтнаму кандыдату ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

8. Дзяржаўны камітэт па тэлебачанні і радыёвяшчанні павінен забяспечыць неабходную прафесійную дапамогу (афармленне студыі, перадэфірную падрыхтоўку, тэхнічнае забеспячэнне, выхад у эфір, выдзяленне вядучых) кандыдатам у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

9. Грамадзянам Рэспублікі Беларусь, палітычным партыям і іншым грамадскім аб'яднанням, працоўным калектывам, даверным асобам кандыдатаў у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь з часу рэгістрацыі кандыдатаў у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь прадастаўляецца права свабоднага і ўсебаковага абмеркавання ў друку, па тэлебачанні і радыё палітычных, дзелавых і асабістых якасцей кандыдатаў у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым рэдакцыі сродкаў масавай інфармацыі абавязаны прадухіляць тэндэнцыйнасць у падачы такіх матэрыялаў, не дапускаць апублікавання або распаўсюджвання лжывых звестак, знеслаўляючых кандыдатаў у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, а таксама публічных заклікаў да байкатавання выбараў. Парадак апублікавання, памер публікацый і месца на паласе, а таксама эфірны час перадач вызначаецца спецыяльнымі загадамі кіраўнікоў сродкаў масавай інфармацыі. Матэрыялы выкарыстоўваюцца рэдакцыямі ў парадку чарговасці іх паступлення.

10. У выпадку парушэння сродкамі масавай інфармацыі Закона аб выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і дадзенай пастановы Цэнтральная і тэрытарыяльныя камісіі па выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь маюць права ставіць ва ўстаноўленым парадку пытанне аб прыцягненні да дысцыплінарнай адказнасці, аж да вызвалення ад займаемых пасад кіраўнікоў сродкаў масавай інфармацыі.

11. Кантроль за выкананнем дадзенай Пастановы ажыццяўляюць Цэнтральная камісія па выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, тэрытарыяльныя камісіі па выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры і друку, Дзяржаўны камітэт па тэлебачанні і радыёвяшчанні.

Першы намеснік Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь
М. МЯСНІКОВІЧ.

Старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
А.АБРАМОВІЧ.

26 красавіка 1994 г.
г.Мінск.

Кожны павінен зрабіць самастойны выбар

4 чэрвеня гэтага года адбудзецца XXXI з'езд Саюза моладзі Беларусі. Бюро яго Цэнтральнага камітэта запрашае ўсіх прэтэндэнтаў у кандыдаты на пасаду прэзідэнта рэспублікі, зарэгістраваных Цэнтральнай выбарчай камісіяй, прыняць удзел у яго рабоце. Бюро ЦК СМБ лічыць неабходным даць усім прэтэндэнтам на прэзідэнцкую пасаду магчымасць звярнуцца да Саюза моладзі з разгорнутай праграмай дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, якую кожны з іх будзе рэалізоўваць у выпадку перамогі на выбарах.

"Саюз моладзі Беларусі не з'яўляецца палітычнай арганізацыяй, — гаворыцца ў заяве Бюро ЦУ СМБ, якая паступіла ў БЕЛІНФАРМ.— У нас няма строгай партыйнай дысцыпліны і іншай ідэалогіі, акрамя ідэалогіі міру і сацыяльнага партнёрства. Вось чаму бюро ЦК СМБ не лічыць магчымым навязваць 123-тысячнай арганізацыі, члены якой маюць сваю думку аб прэтэндэнтах на пасаду прэзідэнта, сваю кандыдатуру. Кожны з нас — ад першага сакратара да радавога члена Саюза — павінен зрабіць самастойны выбар у адпаведнасці са сваімі палітычнымі і чалавечымі сімпатыямі".— гаворыцца ў заяве.

АСОБЫ ВЫПАДАК

Некалькі дзён з жыцця чалавека, які трапіў у "псіхушку"

☐ Іван ГОМАНАЎ, Анатоль РАЗАНОВІЧ

Калегі ведаюць, наколькі няўдзячная справа пісаць пра айчынную псіхіятрыю! Тут міжволі звяртаешся да вопыту амерыканскай медыцыны, якая з'яўляецца для нас своеасаблівым эталонам. І ўсё роўна ўздрыгваеш, калі, дзякуючы папулярнаму тэлесерыялу "Санта-Барбара", на паўгадзіны штовечар трапляеш у клініку доктара Ролінгса. Хоць у іх і палаты цудоўна абсталяваны, і прэпараты самыя сучасныя. Пацыент, калі таго ўрач захоча, ператворыцца ў істоту без прыкмет інтэлекту.

Наша гісторыя здарылася не ў далёкай Санта-Барбары, а ў блізкім сэрцы Брэсце.

Адразу зробім агаворку. Мы не будзем даваць ніякіх ацэнак прафесіянальным якасцям медыцынскіх работнікаў, якія маюць дачыненне да таго, што адбылося,— гэта справа спецыялістаў, кампетэнтных людзей.

Задача журналістаў больш сціплая — прасачыць шлях, які прывёў чалавека са звычайнай псіхікай, прабачце за каламбур, у "псіхушку".

Зразумела, па канонах журналісцкай этыкі, мы не сталі называць ні сапраўднага прозвішча, ні месца работы героя публікацыі. Хоць спачатку ён настойваў, каб карэспандэнты абсалютна нічога не ўтойвалі, у тым ліку і яго анкету. "Мне няма чаго таіцца, — рашуча сказаў малады чалавек.— За свае ўчынкі я адказваю". І ўсё ж, улічваючы неардынарнасць сітуацыі, у якой апынуўся наш новы знаёмы, аўтары гэтых нататак цвёрда вырашылі пакінуць інкогніта героя.

Такім чынам, за справу. Уладзіміру М. 35 гадоў. Прафесіянальны вадзіцель, першакласны механік. Доўгі час працаваў шафёрам. З заплюшчанымі вачыма адрамантуе рухавік не толькі айчынных легкавікоў, але і практычна ўсялякай інамаркі. Быў персанальным шафёрам вядомых у Брэсце асоб. Адным словам, лічыўся ў жыцці шчасліўцам.

Хвароба падкралася нечакана. У 1991 годзе адчуў Валодзя, што пачаў "скакаць" ціск. У той час ён вазіў кіраўніка адной з папулярных на Брэстчыне турыстычных фірм. Па ўласнаму жаданню перайшоў на пасаду слесара-механіка на гэтым жа прадпрыемстве.

У пачатку дзевяностых на грэбені хвалі раптам аказаліся нетрадыцыйныя метады лячэння ўсялякіх хвароб. Псіхатарапеўты, экстрасенсы літаральна запаланілі газетныя і часопісныя старонкі, іх твары замільгацелі на тэлеэкранах. Захапіўся нетрадыцыйным лячэннем і наш герой. Актыўна займаўся практыкаваннямі "Дзеткі" Іванова, наведваў сеансы экстрасенсаў. Наставала, праўда, некаторае паляпшэнне. Але затым хвароба абвастралася зноў.

Тут, канешне, можна папракнуць Уладзіміра за тое, што ён вельмі давяраў усялякім ілжэлекарам. Гіпертанія — штука капрызная, патрабуе працяглага лячэння з прымяненнем медпрэпаратаў. Так, прынамсі, лічаць работнікі Брэсцкага абласнога ўпраўлення аховы здароўя. А ва Уладзіміра ў паліклініцы нават не было ўрача, які б яго пастаянна лячыў. Пры абвастрэнні ён прыходзіў на прыём, і кожны раз яго сустракаў новы ўрач. Дзесьці ў глыбіні душы Валодзі жыў гэты наш шкодны прынцып "А можа абыдзецца!" Не абышлося...

Незадоўга да Новага года, а дакладней 21 снежня, адбыўся гіпертанічны крыз, і "хуткая дапамога" даставіла яго ў кардыялагічнае аддзяленне гарадской бальніцы. Ціск урачам удалося крыху збіць, але хвораму неабходна была шпіталізацыя. Урач Людміла Хільчук, якая лячыла яго, вяла сябе ветліва з хворым.

Справы ў Валодзі стабілізаваліся, самаадчуванне палепшылася. Але жыццё ўносіць свае карэктывы. У ноч з 23 на 24 снежня суседу па палаце становіцца дрэнна. Не спаў і Валодзя, які, па сутнасці, так і не дакрануўся да падушкі, дапамагаючы дзяжурнай медсястры Ніне Мацюшык. Затым у гутарцы з намі Ніна Мацюшык прызнаецца, што без падтрымкі Валодзі ў тую ноч было б нялёгка.

Але вось для нашага хворага бяссонная ноч аказалася сапраўды чорнай. Раніцай ён выглядаў стомленым, настрой сапсаваўся. На гэта звярнула ўвагу ўрач Л.Хільчук, якая лячыла Уладзіміра. Нам цяжка меркаваць, што прымусіла Людмілу Уладзіміраўну ўсумніцца ў "нармальнасці" хворага на гіпертанію, але яна звярнулася па кансультацыю да псіхіятра абласнога псіханеўралагічнага дыспансера Клары Слініковай. Клара Пятроўна, пагутарыўшы нядоўга з Валодзем, робіць лаканічны, але катэгарычны вывад: "Вам, малады чалавек, трэба лячыцца".

Валодзя не стаў абвяргаць довады вопытнага эксперта і, нічога не падазраючы, вярнуўся ў палату. Толькі адпачыць тут яму ўжо не ўдалося. Трохі пачакаўшы, Л.Хіль

ДЗЕВЯТАЕ НЕБА

"Еўраньюс"

Міжнародны аэрапорт пад абстрэлам

Паўстанцы з патрыятычнага фронту Руанды вядуць інтэнсіўны артылерыйскі абстрэл мясцовасці, якая прылягае да міжнароднага аэрапорта руандзінскай сталіцы Кічалі.

Практычна ва ўсіх раёнах горада ідуць жорсткія баі паміж атрадамі РПФ і часцямі ўрадавай арміі. Прадстаўнік місіі ААН па аказанню дапамогі Руандзе Абдул Кабіа паведаміў у кенійскай сталіцы Найробі, што міжнародныя арганізацыі вымушаны прыпыніць дастаўку гуманітарнай дапамогі ў Руанду ў выніку рэзкага абвастрэння сітуацыі вакол аэрапорта.

Марна Клінтану пярэчыць

Нягледзячы на пратэст афіцыйных кітайскіх улад, прэзідэнт ЗША Біл Клінтан заявіў аб сваім намеры сустрэцца з тыбецкім лідэрам Далай Ламай.

Амерыканскі прэзідэнт падкрэсліў, што на чэрвеньскай сустрэчы з кітайскім кіраўніцтвам ён будзе весці гаворку аб парушэнні правоў чалавека ў Кітаі і Тыбеце. Пакуль з парадку дня не знімуцца гэтыя пытанні, Злучаныя Штаты не бачаць магчымасці зняць абмежаванні ў гандлі з КНР.

"Уорлднэт"

Дыпламатычныя захады

Міжнародная дыпламатычная дэлегацыя сустрэлася з прадстаўнікамі баснійскіх сербаў. У яе складзе былі і расійскія дыпламаты.

Гэтая сустрэча прадэманстравала, што пасля спынення агню ў Гораждзе, паміж Расіяй і Захадам няма вялікіх разыходжанняў у падыходах да баснійскай праблемы. Сербская дэлегацыя ўнесла прапанову аб заключэнні мірнага пагаднення на два—тры месяцы, каб зрабіць спробу вырашыць канфлікт шляхам мірных перамоў.

Маленькая сенсацыя ў Маскаце

У сталіцы Амана горадзе Маскат адбылося чарговае пасяджэнне міжнароднай камісіі па водных рэсурсах на Блізкім Усходзе.

Правядзенне пасяджэння камісіі ў Маскаце стала сенсацыяй само па сабе, паколькі ў яе рабоце прымала ўдзел прадстаўнічая ізраільская дэлегацыя. Упершыню амаль за паўстагоддзе існавання Ізраіля яго грамадзяне пабывалі ў адной з дзяржаў Аравійскага паўвострава. Удзельнікі пасяджэння ахарактарызавалі яго вынікі як паспяховыя.

"Супер чэннэл"

У Японіі – кааліцыйны ўрад

Новы прэм'ер-міністр Японіі Ц.Хата сфарміраваў кааліцыйны ўрад парламенцкай меншасці. Найбольшую колькасць пасад (восем) атрымала ў ім Партыя аднаўлення Японіі, якую ўзначальвае сам прэм'ер.

Міністрам замежных спраў стаў лідэр нядаўна створанай ліберальнай партыі 60-гадовы К.Какідзава. Вельмі важную ў Японіі пасаду міністра фінансаў захаваў за сабой Х.Фудзіі.

Рэпарцёры–ахвяры

Кітай узначальвае спіс з 32 краін, у якіх улады кідаюць журналістаў за краты толькі за тое, што яны выконваюць свае прафесійныя абавязкі.

"TV-5"

Гэтыя звесткі апублікавала амерыканская асацыяцыя замежных карэспандэнтаў, якая адзначыла, што ўсяго ў турмах розных дзяржаў свету адбываюць тэрміны пакарання сама меней 148 рэпарцёраў.

146 гадоў – не мяжа

У адной з кітайскіх правінцый адзначаны юбілей, які можна ўносіць у кнігу рэкордаў Гінеса.

Кітайскаму селяніну Гун Лайфу споўнілася 146 гадоў. Ён з'яўляецца самым старым жыхаром Кітая, і яго называюць "каралём доўгажыхароў".

ПАВЕДАМЛЕННІ, АТРЫМАНЫЯ ПА КАНАЛАХ СПАДАРОЖНІКАВАЙ СУВЯЗІ "ЧЫРВОНАЙ ЗМЕНЫ"

АДАМ І ЕВА

Têt-a-têt

Заглянініце ў сябе —

і адразу зразумееце, чаму ад вас збег ваш муж

□ Наталля СТРАЛКОВА, "ЧЗ"

Гадоў дзесяць таму, калі ў якой жонкі разладжвалася раптам сямейнае жыццё (у мужа "заводзілася" даўганогая сакратарка), дзе яна шукала паратунку, куды бегла? Правільна, у партком. Менавіта там канцэнтраваліся галоўныя спецыялісты па праблемах сямейнага і інтымнага жыцця. Іх метады, магчыма, былі не самымі гуманнымі, затое дзейснымі. "Блудныя" авечкі, напалоханыя перспектывай грамадскіх экзекуцый, як міленькія, вярталіся ў лона сям'і... Гэта было, было... І сёння, успамінаючы пра такое простае вырашэнне сямейных пытанняў, іншая кабета не-не, ды ўздыхне: шанцавала ж некалі сяброўкам па няшчасцю! А цяпер куды сунуцца са сваёю бядою?

НАТАЛЛЯ АКОЛА, псіхолаг Рэспубліканскай кансультацыі па праблемах сям'і і шлюбу (што па вуліцы Арлоўскай, 66), упэўнена: калі б больш людзей ведала пра існаванне яе кабінета, ад наведвальнікаў не было б адбою. Яна і так не можа паскардзіцца на адсутнасць "кліентуры" — у журнале для запісу на прыём цяжка знайсці незапоўнены радок...

— А хто вас часцей «даймае» — мужчыны ці жанчыны?

— Пароўну, як кажуць, "фіфці-фіфці". Але калі жанчына звяртаецца па дапамогу, яна лічыць гэта чымсьці нармальным, натуральным. А мужчына ўпэўнены, што ён, прыйшоўшы сюды, здзейсніў нейкі гераічны ўчынак, і яму проста абавязаны дапамагчы. Жанчыне, у адрозненне ад мужчыны, не трэба канкрэтнай парады — яна вырашае ўсё на ўзроўні сваіх эмоцый і інтуіцыі. А мужчына заўсёды чакае пэўных рэкамендацый, якія можна зараз жа ўвасобіць на практыцы. І першыя, і другія прыходзяць тады, калі ў іх ужо з'явілася праблема, з якой яны не могуць справіцца самі.

— Калі я правільна здагадваюся, хутчэй за ўсё гэта...

— Няверагасць, рэўнасць. Калі чалавек дакладна ці амаль беспамылкова ведае, што другая "палова" яму здрадзіла. Самае цікавае — тыя, хто сюды прыходзяць, хочуць захаваць сям'ю, скасаванне шлюбу бачыцца ім самай крайняй мерай.

— Ну і давайце спынімся на гэтай праблеме. Што б вы параілі жанчыне ў першую чаргу? Як сябе паводзіць? Магчыма, ёсць нейкія жаночыя хітрыкі і прыёмы, карыстаючыся якімі, можна зноў «закахаць» мужа ў сябе?

— Давайце пачнём з таго, што падазрэнне — яшчэ не здрада. Ёсць такія вельмі пільныя і прыдзірлівыя жонкі, якія самі ўтвараюць праблему з нічога — на пустым месцы. Яны чапляюцца да нязначных дробязяў, якія здаюцца ім "уліками". Напрыклад, муж стаміўся, у яго часовая дэпрэсія, ён надта доўга чытае газету... Але ж мужчына прыйшоў з работы, а там могуць здарыцца ўсялякія непрыемнасці. Да таго ж, "моцны" пол увогуле менш выносліў за жанчын. Ну, няхай муж адпачне, пачытае. А заўтра сам вам пра ўсё раскажа. Не трэба мучыць яго дарэмнымі папрокамі.

Калі факт здрады, так бы мовіць, устаноўлены дакладна, вырашыце для сябе галоўнае пытанне: ці зможаце вы перасіліць гэты бар'ер. Развод — значыць развод. Але калі вам патрэбна сям'я і згода ў ёй, тут ужо неабходна зусім іншая тактыка. Пастарайцеся даведацца ці зразумець, што яго не задавальняе, загляніце ў сябе. Мужчыны — не такія ўжо гулякі, як мы часцяком іх малюем. Кожнаму з іх хацелася б мець дома тое, за чым ён "палюе" на баку. Тады не трэба было б далёка хадзіць. Безумоўна, "усё-усё-усё" даць не можа ні адна жонка. Але ў кожнага мужчыны ёсць асноўныя патрабаванні, якія яна павінна задавальняць. Адным больш за ўсё падабаюцца "салодкія цукеркі ўвагі", другім — чысціня і парадак, трэція ўзводзяць у ступень сексуальныя адносіны. Вучыцеся гэта адчуваць і — адпавядаць.

— Ці не занадта вялікія патрабаванні прад'яўляюцца да нас? Ствары яму ўсе ўмовы, насмаж бліноў, перасцялі ложак, надушыся яго любімымі духамі і чакай на парозе з усмешкай, як параіла нядаўна вядучая адной радыёперадачы. А ён прыйдзе пад раніцу і, не распранаючыся, бухнецца ў ложак. Вось дзякуй!

— Вы маеце рацыю. Многія жанчыны і так за сабою сочаць, цырульніка рэгулярна наведваюць, касметолага, мадэльера. Ды і гаспадыні ўмелыя. А шчасця — няма. Значыць, не той "ключык" да замка падабралі, штосьці галоўнае ўпусцілі. Бліны тут наўрад ці дапамогуць. Вы вось пра жаночыя "хітрыкі" пыталіся... Так, вы можаце мужчыну расчуліць на нейкі час, і, скажам, сёння вечарам ён застанецца з вамі. Фармальна папрысутнічаць, дзеля "галачкі". Але ў выніку будзе ўдвая больш ненавідзець сваю "турэмшчыцу", дзякуючы якой прапусціў рамантычнае спатканне.

Набярыцеся мужнасці і перастаньце лазіць па яго кішэнях, шукаць любоўныя запіскі і жаночыя валасы на пінжаку. Ну не бывае шчасця з-пад палкі! Наадварот, чым мацней жанчына стараецца трымаць, тым больш мужчына адчувае насілле над сабой і ў выніку гаворыць "бывай!". У многіх рэчах вінаватыя мы самі. У жыцці нічога не адбываецца дарэмна. І калі здарылася так, а не інакш, значыць, настаў час звярнуць увагу на сябе. Калі вы сябе не любіце, дык за што будзе любіць вас Ён?

Жанчыны — вы і самі чулі не раз — часта гавораць так: "Я прыбіраю, даглядаю дзяцей, а дзе ж удзячнасць?". Прабачце, а чаму муж павінен быць жонцы ўдзячны? Гэта зноў жа ставіць яго ў залежнасць ад яе. Атрымліваецца, што ён нечым абавязаны, а ўсё, што яна робіць, — яна робіць не таму, што гэта натуральна, а як бы ў чаканні нейкай узнагароды. Па сутнасці, гэта памылковая пазіцыя. Мужчынам ніколі не падабалася адчуваць сябе залежнымі. Схіляюся перад жанчынамі, якія знайшлі ў сабе мужнасць гэта прызнаць. У маёй практыцы былі ўсяго два падобныя выпадкі. Адна з гэтых жанчын расказвала мне: "Я рыдала паўтара года, умаляла, кленчыла, прыніжалася... Ён не звяртаў на гэта ніякай увагі, перыядычна не начаваў дома, прыходзіў раніцай перад работай і клаўся са мной у адзін ложак... Потым я ўзяла сябе ў рукі, перастала плакаць і хвалявацца, перастала дапытвацца, дзе ён быў і чаму не кахае мяне". Зразумела, мужа гэта заінтрыгавала і нават пакрыўдзіла. Як так — яго персонай перасталі цікавіцца? Стаў часцей бываць дома, начаваць з жонкай, і паступова жыццё наладзілася...

Я захапляюся такімі жанчынамі, яны развіваюцца самі ў сабе і адначасова робяцца больш цікавымі для астатніх. А што датычыць мужчынскіх здрад... На маёй памяці быў толькі адзін выпадак, калі мужчына сапраўды пакахаў іншую жанчыну. Большую ж частку іх папросту "цягне на экзотыку". Але таму, хто ўсё жыццё прывык, так бы мовіць, есці бульбу, экзатычныя фрукты хутка надакучваюць.

— Якія мужчыны больш «небяспечныя» для шлюбу — спрадвечныя «донжуаны» ці тыя, хто «зрываецца» рэдка, але, як кажуць, метка?

— Другія. Першыя ўяўляюць адносную небяспеку толькі ў тым выпадку, калі іх "накрылі". Калі вы ўжо адносіце сябе да разраду мужчын, якім патрэбна пастаянная разнастайнасць, дык ні ў якім разе не прызнавайцеся ў гэтым жонцы. Нават калі яна пачне прасіць: "Ну скажы, я ўсё зразумею...", — адказвайце цвёрда: "Не!". Калі вы хочаце захаваць і жонку, і палюбоўніцу, дык паводзьце сябе так, каб ім абедзвюм было добра. Інакш і кашу заварваць не трэба.

Сустракаюцца дзівакі, якія проста імкнуцца пакаяцца ў грахах роднай "палове". Я тлумачу гэта тым, што ў іх ёсць свае, патаемныя прычыны падобнага "геройства".

Першая — зрабіць жонцы балюча; другая — самасцвердзіцца, каб яна ведала, што ён — не анча.

Але разумныя мужчыны часцей за ўсё ў гэтым не прызнаюцца.

— А як жа яны паводзяць сябе ў выпадку здрады жонкі? А то мы з вамі ўсё пра жаночыя беды размаўляем...

— Гэта натуральна — жанчына заўсёды больш клапоціцца пра сям'ю, яе захаванне. А мужчына — істота непрадказальная. У мяне быў выпадак, калі муж адпусціў жонку пажыць з другім і параўнаць, дзе лепш. У выніку яна вярнулася. Другая сям'я, новы шлюб далёка не заўсёды прыносяць шчасце і задавальненне. Трэба нанова "прыціцца" да чалавека, прывыкаць да яго набору "плюсаў" і "мінусаў".

— Значыць, захаванне сям'і — гэта самамэта?

— Зусім не. Наадварот, далёка не заўсёды склейванне "чарапкоў" з'яўляецца лепшым выйсцем з тупіка.

— Выходзіць, і ў вашай рабоце бываюць «тупіковыя» сітуацыі? Людзі звяртаюцца па дапамогу, а вы ўжо разумееце, што іх «цягнік» адышоў...

— Я, калі можна так сказаць, праводжу чалавека з завязанымі вачыма праз цёмны пакой і паказваю яму: вось шафа, вось канапа, вось акно, вось дзверы. Выбірай сам, у які бок табе трэба ісці. Мае пацыенты часта просяць: паўплывайце вы на яго (яе)! Але ж гэта нерэальна. Я магу толькі прааналізаваць сітуацыю, раскрыць прычыны таго, што яны не разумеюць у паводзінах адзін аднаго. Канчатковы выбар чалавек павінен зрабіць сам. Я не маю права сказаць яму: гэта адназначна белае, гэта — чорнае. Так не бывае, усё мае свае адценні, а ў любога правіла дастаткова выключэнняў. Ёсць людзі, якія мірацца з неверагоднымі заганамі адзін аднаго, і жывуць разам і выхоўваюць дзяцей... Значыць, ім так падабаецца. Як можна на іх уплываць? Між тым, бываюць сем'і без відавочных заган, муж і жонка не п'юць, не здраджваюць адзін аднаму, але пасля размовы з імі я разумею: яны не могуць жыць разам. Была ў мяне на прыёме такая вельмі актыўная жанчына. Яна проста "прыціснула" мужа гэтай сваёй актыўнасцю — за ўсё бралася першая, усё рабіла сама. Дайшло да таго, што муж толькі ляжаў на канапе і глядзеў у столь. Ён ужо і сам нічога не хацеў. Пры знешняй прыстойнасці адносін яны так аддаліліся адзін ад аднаго, што выратаваць іх не ўяўлялася магчымым.

— Шкада, што яны звярнуліся да вас так позна...

— Ну, гэта — агульная бяда. Паколькі дашлюбнае кансультаванне ў нас не развіта ўвогуле, людзі прыходзяць часцяком ужо тады, калі застаецца толькі разводзіць рукамі. А тым, у каго адносіны яшчэ ў стадыі станаўлення, хачу параіць зайсці да нас. Не хвалюйцеся, ніхто не збіраецца ўгаворваць або адгаворваць вас ад вашага выбранніка. Проста мы дапаможам даведацца, дзе, чаму, на якой падставе паміж вамі могуць узнікнуць канфлікты, пастараемся іх папярэдзіць.



ТЫДЗЕНЬ ПА ГАРАСКОПУ

2–8 мая

ЦЯЛЕЦ

Лепш не рызыкуйце нічым у панядзелак, каб пазбегнуць грашовых страт. Пастарайцеся не канфліктаваць у сям'і. Беражыце сваё здароўе.

Наведайце сваіх сяброў у пятніцу.

Стрымлівайце свае эмоцыі ў выхадныя. У каханні ваша слова першае. Магчыма матэрыяльная падтрымка з нечаканай крыніцы.

БЛІЗНЯТЫ

Не марнуйце час у першыя дні месяца. Рызыкуйце!

Адкрыюцца цудоўныя перспектывы ў сардэчных справах.

Магчымы нечаканы фінансавы паварот у сераду. Спрыяльны час для заняткаў спортам.

Сяброўскія кантакты дапамогуць зняць напружанасць у нядзелю. Поспех у каханні.

РАК

На пачатку тыдня ў вас будуць перамены ў асабістым жыцці. Хмары над вашай галавой развейваюцца.

Фінансавая ўдача вас чакае ў чацвер. Але не давярайце нікому сваіх інтымных адносін.

Можаце рызыкаваць у суботу. Настойлівыя будуць узнагароджаны. Звярніце ўвагу на сваё здароўе.

ЛЕЎ

Не праяўляйце залішнюю актыўнасць у першыя дні мая. Лепш перачакайце. Можаце выехаць за горад.

Устрымайцеся ад паспешлівых рашэнняў у сераду. Захоўвайце асцярожнасць у паездках.

Спрыяльны час для кахання. Стрымлівайце свае эмоцыі ў нядзелю.

ДЗЕВА

Магчымы матэрыяльны прыбытак у панядзелак. Не давярайце нікому вашых асабістых праблем.

Верагоднасць траўм — у сераду. Будзьце ўважлівымі. Кантралюйце сітуацыю ў сям'і

У выхадныя пашырыцца кола вашых знаёмстваў. У каханні будзьце велікадушнымі.

ШАЛІ

Пастарайцеся не заключаць ніякіх фінансавых здзелак на пачатку тыдня. Поспех у інтымным жыцці. Пазбягайце канфліктаў у сям'і.

Не перанапружвайце нервовую сістэму ў сераду.

Адкладзіце ўсе віды фінансавых аперацый у нядзелю. Магчымы мімалётныя захапленні.

СКАРПІЁН

У аўторак будзьце ўважлівымі ў дарозе. Атрымаеце добрыя навіны здалёк. Спрыяльны час для інтымных адносін.

З'явяцца перспектывы паляпшэння фінансавага становішча ў апошнія дні тыдня. Звярніцеся па дапамогу да сваіх сяброў.

СТРАЛЕЦ

Многае будзе залежаць ад вашых знаёмых у панядзелак. Не выключана цікавае знаёмства.

Не слухайце ніякіх плётак у чацвер. Эканомце грошы.

Займіцеся спортам у выхадныя. Не стаўце сябе ў цэнтр сусвету. Звярніце ўвагу на свой страўнік.

КАЗЯРОГ

Будзьце ўпэўненымі ў сабе. У сярэдзіне тыдня наведайце сваіх сяброў. Поспех у каханні. Магчымы нечаканы грашовы прыбытак.

Не вырашайце ніякіх юрыдычных спраў у пятніцу.

Стрымлівайце свае эмоцыі ў нядзелю. Не сварыцеся з роднымі.

ВАДАЛЕЙ

На пачатку месяца — спрыяльны час для эротыкі. З'явяцца нядрэнныя перспектывы ў бізнесе. У каханні будзьце ўважлівымі і пяшчотнымі.

Вырашацца хатнія праблемы ў суботу. Больш часу пастрайцеся правесці на свежым паветры.

РЫБЫ

Поспех у фінансавай сферы і ў каханні ў вас будзе ў панядзелак.

Не давярайце нікому вашых інтымных адносін у сераду.

Праяўляйце больш характару і настойлівасці ва ўсім. Спрыяльны час для творчай дзейнасці.

У выхадныя кантралюйце сітуацыю ў асабістым жыцці.

АВЕН

Не сварыцеся ні з кім у аўторак, каб у далейшым не шкадаваць. Пастарайцеся не адмаўляцца ад здзелак, якія прапануюць вам сябры. Дайце адпачынак свайму сэрцу.

Лепш не рызыкуйце ў бізнесе ў чацвер.

У канцы тыдня — поспех у каханні.

Відэасалон

Гучыць музыка ў камні.
Фотаэшод Жанны МАЁРАВАЙ.

«НОТНЫ АРКУШ» № 8 (243)

Вядучы Вітаўт МАРТЫНЕНКА

Тэл. 68-29-26

Спяваем па-беларуску

ВЯЛІКДЗЕНЬ

Музыка Уладзіміра МАКАРЭВІЧА. Словы Антаніны ХАТЭНКА.

1. Як доўга мы за кратамі сядзелі,
Знявечаны цярплівасцю народ...
Пашлі надзею, Вербная нядзеля!
Шапні замову, старажытны родзе!
Зняважаны, расцяты і распяты
Гукні вясну, мой нескароны люд!
Спавітыя жальбою Курапаты —
Тваёй глухой маўклівасці прысуд.

2. Шляхі вядуць да храмаў ацалелых.
Бруяць крыніцы ля святых дарог.
Уваскрасае бел-чырвона-белы
Дзядоўскі сцяг ахвярных перамог.
Палае сонца
шчодра на Вялікдзень,
Дружына валачобная ўстае...
Якімі з вамі парасткамі ўзыдзем
Мае вы людцы, любыя мае?



Гіт-парад

Беларусь — Радзіма-маці

Відаць, не надакучыла яшчэ гісторыка-патрыятычная тэма ні выканаўцам, ні прыхільнікам іхняй творчасці, пра што сведчыць радок з песні-лідэра 30-га этапа нашага гіт-парада, які даў загаловак гэтаму агляду пошты.

Партрэт лідэра — Андруся Мельнікава — вы бачыце на здымку, а пачуць яго можна будзе ў беларускай праграме радыё "Свабода" 1 мая, на праваслаўны Вялікдзень.

Аршанскі бард, зазначым, не адзінокі ў красавіцкай дзесятцы беларускага гіт-парада. Ёсць тут і гамяльчук Едрусь Акулін, імінчанка Лана Медзіч, і навапалачанін Сяржук Сокалаў-Воюш, які цяпер жыве ў Нью-Йорку. Балазе пакрысе бардаўская песня набывае сталых заўзятараў. А ёсць сярод іх і такія натхнёныя асобы, як, напрыклад, Таццяна Лапцёнак з Мінска, якая піша пра сваіх куміраў ледзь не белым вершам: "Да стромкай вышыні ўзмывае голас Ланы Медзіч уейных песнях. Слухаеш і нібы галава ад гэтай вышыні кружыцца. Дзіўна знайсці птушку сярод людзей, такую лёгкую і такую лагодную. Кожную ейную песню так чакае сэрца ў радасці прадчування новай сустрачы, калі зноў закружыцца галава ад той самай вышыні ды ўзнёсласці".

Шкада, што нічога падобнага апошнім часам не пішуць прыхільнікі рок-музыкі. Няўжо яна не абуджае паэзію ў душы? Ды, зрэшты, і прозы нешта апошнім часам мала. Усе вы, шаноўныя, чамусьці скаціліся да голай статыстыкі.

А чаму б, напрыклад, не праявіць такую звычайную разважлівасць, як у лісце віцябчаніна Алеся Бынькова. З ягонага допісу мы даведваемся і пра музычныя прыярытэты аўтара, і проста пра тое, як жывуць людзі, як кажуць, на месцах: "Вельмі ўсцешаны з'яўленнем у гіт-парадзе Сяржука Сокалава-Воюша, за якога я аддаў голас мінулым разам. Міжволі ўпэўніваешся ў існаванні Сусветнага Розуму. Але 10-е месца прымушае даслаць яшчэ адзін ліст, які я ўкладваю ў апошні канверт, бо ў Віцебску яны зніклі з усіх аддзяленняў сувязі".

Вось такая бывае музычка! Хочацца спадзявацца, што наш гіт-парад усё ж не прывядзе да поўнага краху Міністэрства сувязі Беларусі, а яно — у сваю чаргу — наш гіт-парад. Засцерагчыся, аднак, мусім, дзеля чаго дазваляем нашым рэспандэнтам звязвацца з намі не толькі лістоўна, але і тэлефанічна.

Каб гэты агляд пошты не быў жанрава-аднастайным, звернем увагу на кароценькі, але эмацыянальны ліст аднаго прыхільніка бард-рока — Зміцера Ліпніцкага з Гарадзеншчыны: "Даеш "Камэлоту" першае месца!" Далей ідзе спіс, дзе ўсе тры пазіцыі займае "камэлотаўская" песня "Краіна талераў". Першага месца яна пакуль не дасягнула, але карысць такога крока рок-фаната відавочная — калектыў дацягнуў, нарэшце, да тройкі лідараў.

Шчырымі думкамі дзеліцца ў сваім лісце аматар беларускай народнай песні Васіль Тулька з Крычава: "Фальклор для мяне існуе толькі аўтэнтычны, але ягоных выканаўцаў, на жаль, ніколі не пачуеш ні па радыё, ні па тэлебачанні. Што да сродкаў масавай інфармацыі, дык мяне толькі аднойчы парадавала французская фірма "Auvidis", выпусціўшы кампакт-дыск "Фальклор беларускага Палесся". Гэтае выданне прывёз мне з замежнай камандзіроўкі швагер. Але калі ўжо ёсць дыск, дык чаму яго не круцяць па радыё? Хоць бы ў вашым гіт-парадзе".

Адно можам адказаць Васілю: у гіт-парадзе гучыць усё, што набірае дастаткова галасоў ад прыхільнікаў. Відаць, на вялікі жаль, той парыжскі дыск замала вядомы нашай публіцы, хоць вартасць гэтага выдання не выклікае сумненняў. Ды й увогуле, гарачая беларуская дзесятка таму і гарачая, што ў ёй заўсёды цесна, яна заўсёды абнаўляецца і сёння выглядае наступным чынам:

1. "Вяртанне Булак-Балаховіча" (муз. і сл. А.Мельнікава). Андрусь Мельнікаў.
2. "Чаму ж мне не пець?" (беларускі фальклор). Міхась Забэйда-Суміцкі.
3. "Краіна талераў" (муз. і сл. Зм.Сідаровіча). "Камэлот".
4. "Жаль не пакіне мяне" (муз. і сл. С.Мядзведзевай). Лана Медзіч.
5. "Пяшчота ліўня" (муз. і сл.Е.Акуліна). Едрусь Акулін.
6. "Песня падарожніка" (Я.Маркаў—С.Кныш). "Бонда".
7. "На далоні" (В.Корань—Ф.Аксёнцаў). "Уліс".
8. "Фронт" (муз. і сл. С.Сокалава-Воюша). Сяржук Сокалаў-Воюш.
9. "Вецер" (А.Кузьмін—А.Аркуш). "Мясцовы час".
10. "Кастрычніцкі цягнік" (муз. і сл. калектыву). "Мроя".

Вясна — час надзей і абнаўлення. А мы вам, шаноўныя аматары музыкі, падрыхтавалі своеасаблівае абнаўленне, вырашыўшы спыніцца на гэтым 30-м гіт-парадзе. Бадай, не засталося ў беларускім пантэоне поп-музыкі такой зоркі, якая б засталася без нашай кароны. Новыя ж імёны, спадзяёмся, будуць гучаць у нас сола.

Вінцук ГУНЕНКА.
Фота У.ПАНАДЫ.

30, субота

Беларускае тэлебачанне

11.20. Тыдзень планеты.
11.35. "У імя ўваскрэсення".
11.45. 20 мінут рэдактара.
12.05. Дзесяць запаведзяў.
12.35. "Сталіца". Тэлечасопіс.
12.55. Творчасць Зміцера Марозава.
* 13.45. "Мой маленькі поні".
14.15. Акадэмічны час у Акадэмічным тэатры.
15.15. Вас выклікае Спартландыя.
16.35. "Залатая дзесятка". Фінал.
* 18.25. "Чарапашкі ніндзя".
19.00. "Выдатныя маркі аўтамабіляў".
19.35. "Нов і К"-топ-10.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
21.45. Пяць хвілін на жарты.
◆21.50. "Футбалісм".
23.20. Ніка.
23.35. Вялікдзень. Трансляцыя ўсякночнай з Мінскага Саята-Духавага кафедральнага сабора.

Канал "Астанкіна"

11.20. Палітра В.Тэмлін.
11.40. Дапамажы сабе сам.
◆12.10. "Сэрцы трох".
14.00, 22.10. Навіны.
14.25. Сустрэча для вас. В.Астаф'ев.
15.20. У свеце жывёл.
16.00. Каханне з першага погляду.
16.40. Да і пасля. Вядучы – У.Малчанаў.
◆17.30. "Чалавек на ўсе часы".
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны плюс.
20.35, 22.05. Надвор'е.
20.45. Хакей. Чэмпіянат свету.
22.20. Вялікдзень Хрыстовы. Трансляцыя набажэнства з Богаяўленскага кафедральнага сабора г.Масквы.

Канал "Расія"

◆11.00. "Цілер прасланяецца", сын чалавечы".
12.35. Мульці-пульці.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.20. Вялікі хакей.
13.50. Мір і вайна.
14.20. Казырная дама.
14.55. "К-2" прадстаўляе: "Зоркі Амерыкі".
◆15.25. "Расія маладая".
16.25. Футбол без граніц.
17.20. Ніхто не забыты.
17.25. "Рэквіем". Частка 1-я.
18.15. Саята кожны дзень.
18.25. Вуснамі дзіцяці.
◆19.25. "Маці Ісуса".
20.55. Інтэрв'ю Патрыярха Маскоўскага і ўсёе Русі Алексія II.
21.40. Аўтаімгненне.
21.45. Спартыўная карусель.
21.50. Сляпае Еўропа.
22.00. Конкурс песні Еўрабачання.

Санкт-Пецярбург

9.30. "Вячэрні звон" у ранішнім эфіры.
10.30. Хуткая дапамога.
11.00. Канцэрт па заяўках.
11.30. Тэледактар.
11.45. "Сярэбраная нітка". Праграма для пажылых людзей.
12.15. "Адроджаны звон". Тэлефільм.
◆12.25. "Жаваранак".
14.05. Фільмы цыкла "Хрыстос і яго Царква".
14.45. Спартыўны турызм у Тунісе.
◆15.15. "З жыцця земскага ўрача".
16.00. Дзецям пра зверанят.
16.15. Імперскія навіны.
16.45. Вялікі фестываль.
17.00. Аўтапілот.
17.15. Крымінальнае дасье.
17.35. Тэлефільм.
18.10. Экспрэс-кіно.
18.30, 21.45. Інфарм ТБ.
18.55. П.Паўлоўскі. "Элегія". Спектакль.
22.00. Ваш стыль.
22.05. Храм.
22.40. Трансляцыя Велікоднай службы са Саята-Троіцкага сабора Аляксандра-Неўскай Лаўры.

8-ы канал

15.00. Аб'явы. Рэклама.
15.05. Праграма пра здароўе "Жыццёвы выбар", "Алошні выхад".
15.30. Прапаведнік Кенет Коўпленд.
◆18.00. "Упершыню замужам".
17.35. Меркаванні пра джаз.
◆18.25. "Казачная работа".
18.50. Шалом з Іерусаліма.
* 19.50. Мультфільм.
20.10. Сямейнае кола.
◆20.20. "Лёс". 60-я серыя.
21.00. СОЛТЭК. "Спартыўная мазаіка".
21.30. Тыдзень з "Хрыстафорам".
21.45. Опра Уінфры шоу. Любоўныя гісторыі.
◆22.30. "Чароўнае люстэрка". 3 серыі "Я – шпіён".
23.25. Рэклама. Аб'явы.

1, нядзеля

Беларускае тэлебачанне

8.25. Пад купалам Сусвету.
8.35. Пяць хвілін на жарты.
* 8.40. "Чарапашкі ніндзя".
9.15. MTV. Лепшыя хіты.
9.45. Аэробіка. Урокі Наталлі Наважылавай.
10.20. Вялікдзень у вёсцы Гаўкі Слуцкага раёна.
11.40. Выступленне Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, патрыяршага Экзарха ўсёе Беларусі Філарэта.
11.55. Сустрэчы ў студыі "Існасць".
13.25. Вяскоўцы. Крупскія цудадзеі.
13.55. Паміж намі, жанчынамі...
14.40. Сустрэчы ў студыі "Існасць".
16.10. І Рэспубліканскі тэлевізійны фестываль юных талентаў.
17.40. Прем'ера. "Каго любіш – выбірай".
17.50. "Гінес-шоу."
* 18.20. "Чарапашкі ніндзя".
18.55. Каралеўскае палаванне.
20.00. Панарама.
20.35. Пад купалам Сусвету.
20.40. Калыханка.
21.00. Пяць хвілін на жарты.
◆21.10. "Начаёў вярнуўся". (Францыя).
23.05. "Не забудзьцеся ўключыць тэлевізар".
23.15. Футбол. Чэмпіянат Беларусі.

Канал "Астанкіна"

8.00. Раным-рана.
8.30. Зоркі фальклору Расіі ў праграме "Велікодны звон".
9.45. Пакуль усе дома.
10.15. Спартыўная гімнастыка.
11.00. Ранішняя зорка.
◆11.50. "Па закону Джунглю". 1-я серыя.
* 13.00. "Піф і Геркулес".
13.10. "Падводная адысея каманды Кусто".
14.00, 17.25, 23.00. Навіны.
14.20. "Час Міраба". Д/ф.
15.15. "Галактыка. Цырк. Новыя зоркі".
* 15.45. "Кот Фелікс", "Сапраўдныя паляўнічыя на прывідаў".
16.40. Панарама.
17.20. Жывое дрэва рамёстваў.
17.40. Святочны канцэрт.
18.55. Тэлеопцыя.
◆19.10. "Графіня Шарамецева".
21.00. Нядзеля.
21.45. Спартыўны уік-энд.
22.00. Ала Пугачова сустракае гасцей.

Канал "Расія"

7.00, 13.00, 19.00, 22.20. Весткі.
8.30. "Светлая Хрыстова нядзеля". Д/ф.
9.00. Добрай раніцы, Еўропа.
9.30. Танцавальны марафон.
10.20. Аты-баты...
10.50. Каробка перадач.
◆11.05."Шчан з сузор'я Гончых Псоў".
12.15. "Мне засталася адна забава...". А.Малінін.
13.20. "Не высечы..."
13.35. Кіпрас Мажайка. Рэпартажы з "Малой Еўропы".
14.00. Рэтра-шлягер.
14.30. "Час міру". В.Астаф'ев.
14.50. "Формула-1". Гран-пры Сан-Марына.
* 17.00. "Гуфі і яго камада", "Чорны плашч".
18.00. Свята кожны дзень.
18.10. У Ксюшы.
◆19.25. "А ці быў Каролін?" 1-я серыя.
20.50. Аншлаг. М.Еўдакімаў.
22.40. Аўтаімгненне.
22.45. Зоркі гавораць.
22.50. Спартыўная карусель.
22.55. Канцэрт Мадонны ў Сідні.

Санкт-Пецярбург

* 9.30. "Аўтамабіль ката Леапольда" і інш.
10.00. Экспрэс-кіно.
10.15. Іграе В.Рэпін.
11.00. "Нядзельны лабірынт".
12.35. Фільм-балет.
13.15. Сем сланоў.
13.45. Гістарычны альманах.
14.30, 18.55, 21.50. Інфарм ТБ.
14.45. У часы клавесіну і мадрыгалаў.
15.00. "Маліновая кошка". Музычная казка.
* 15.50. "Не хачу і не буду".
16.00. Фільмаскоп.
16.10. "Шчаслівыя моманты". Д/ф.
17.00. Чэмпіянат Італіі па футболу.
19.20. "Без назвы".
◆19.40. "Геніяльная ідэя".
21.05. Я.Шыфрын у Пецярбургу.
22.05. Ваш стыль.
22.15. Гумарыстычная праграма С.Альтмава.
22.25. Адамаў яблык.
◆23.25. "Аголеная ў капелюшы".

8-ы канал

15.00. Аб'явы. Рэклама.
◆15.05. Мастацкі фільм.
17.00. ММ-4. "Нямецкая хваля".
17.30. ММ-4. "Прапаведнік Кенет Коўпленд".
◆18.00 Тэлесерыял "Заліў Небяспечны". "Атручаны заліў".
18.30. СОЛТЭК. "Тэлефон". "Вуліца".
19.00. "Бізнес-план". ММ-4.
* 19.25. Мультфільм.
19.40. Спартыўная паралель.
20.25. Тыдзень з "Хрыстафорам".
20.35. Дзікая Амерыка.
◆21.10. "Ісус".
23.25. Рэклама. Аб'явы.

АДПАЧНІ!

КАЛІ НЕ ПА КІШЭНІ ПУЦЁЎКА НА МІЖЗЕМНАЕ МОРА – ВЫБІРАЙЦЕ МІНСКАЕ...

Набліжаецца час адпачынку, і пачынаць думаць і клапаціцца пра яго, безумоўна, трэба ўжо цяпер. Аб гэтым — наша размова з намеснікам генеральнага дырэктара акцыянернага таварыства "Спутнік" Тэславам Шульгой.

— Людзі схільныя летам адпачываць — якіх бы гэта ні каштавала ім грошай, яны імкнуцца патраціць на добры і запамінальны адпачынак зароблене...

– Так, сёлета, як і ў мінулыя гады, "Спутнік" актыўна рыхтуецца да летняга сезона. У апошні час склалася паўная сістэма – з кастрычніка па красавік фірма ў асноўным займаецца камерцыйным турызмам, арганізуе шоп-туры. А менавіта цяпер надышоў час зрабіць акцэнт на арганізацыю адпачынку для ўсіх катэгорый грамадзян.

— У большасці насельніцтва, дарэчы, склаўся нейкі стэрэатып: сама назва "Спутнік", як і "Інтурыст", асацыіруюцца з даволі дарагімі пуцёўкамі, якія можа купіць толькі пяць працэнтаў насельніцтва, а для астатніх іх кошт недасягальны...

– Таму сёлета мы імкнуліся падрыхтаваць разнастайныя прапановы, якія б адпавядалі менавіта ўсім катэгорыям. У першую чаргу, ёсць шэраг турыстычных баз Беларусі: "Нарачанка", "Высокі бераг", на Белым возеры Брэсцкай вобласці, а таксама ММЦ "Юнацтва", якія мы прапануем у цесным супрацоўніцтве з "Белінтурыстам" і "Беларусытурыстам". Кошт пуцёўкі на 15 дзён адпачынку на турбазе Беларусі складзе каля 400-500 тысяч беларускіх рублёў.

Другая цэнавая катэгорыя – гэта пуцёўкі на адпачынак у паўднёвыя турыстыцкія былога Саюза (Крым, Сочы) і ў Прыбалтыку. Да прыкладу, каб адпачыць на турбазе "Паўлінка", недалёка ад Еўпаторыі, трэба заплаціць за 14 дзён 1200000–1500000 "зайцоў".

І, нарэшце, наступная цэнавая катэгорыя – пуцёўкі ва ўсім вядомыя Балгарыю і Румынію. Балгарскія курорты ў горадзе Кіцен, а таксама "Сонечны Бераг" і "Залатыя Пяскі" штогод прываблiваюць шмат турыстаў. Усе прапануемыя намі гасцініцы змяшчаюцца ў ста метрах ад мора, у самім комплексе ёсць рэстаран, бар, дыскатэка – словам, вам будзе забяспечаны даволі цывілізаваны адпачынак у маляўнічых месцінах. За пуцёўку вам давядзецца заплаціць каля 260 даляраў (без праезду). Сумеска з "Белінтурыстам", пачынаючы з 31 мая, кожны аўторак выконваецца чартэрны рэйс "Мінск–Бургас" (кошт білетаў у абодва бакі – 120-130 "зялёных"). Словам, усё "задавальненне" будзе каштаваць вам каля 400 даляраў. На дзіцячыя пуцёўкі – скідкі (да 50 працентаў). Дарэчы, скідкі (да 10 працентаў) распаўсюджваюцца і на тых, хто карыстаўся паслугамі "Спутніка" і ў мінулым годзе, як на сталых кліентаў. Таксама існуе і сістэма скідак у залежнасці ад часу набыцця – чым раней вы купіце тур, тым больш з'эканоміце (у красавіку, напрыклад, 20-30 даляраў, у маі – удвая менш).

— А калі ўзяць самы "вытанчаны" густ, якія вашыя прапановы тым, хто мае сродкі, каб быць "гурманам" ад турызму?

– Яны, калі пажадаюць, могуць трапіць у любы рэгіён свету: у Туніс, Марока, Мексіку, Аўстралію, на Канарскія астравы, востраў Фіджы. Для аматараў марскіх круізаў прапануем пуцёўкі ў Міжземнаморскі круіз або ў круіз "Паўночная Еўропа" з наведваннем скандынаўскіх краін.

— Дарэчы, некаторыя фірмы ў мэтах рэкламы пайшлі на тое, каб знізіць кошт сваіх пуцёвак на распродажах. А як ставіцца да падобных мерапрыемстваў "Спутнік"?

– Мы таксама маем намер 4-5 мая арганізаваць кірмаш-распродаж сваіх пуцёвак. Прапануем усім жадаючым наведаць нас у гэтыя дні з 10 да 20 гадзін па адрасу: Мінск, вул.Карла Маркса, 40. Тут, у холе, і адбудзецца распродаж, наведвальнікі змогуць пазнаёміцца з нашымі маршрутамі і паглядзець рэкламныя буклеты. Для тых, хто набудзе пуцёўкі ў гэтыя дні, яны будуць танкейшыя на 10 працентаў, чым звычайна. І влошняя мая парада чытачам: падарожнічайце са "Спутнікам" – не пашкадуеце.

Гутарку вяла
Наталля ПЛЫТКЕВІЧ.

ХАТНІ ЭКРАН

2, панядзелак

Беларускае тэлебачанне

8.30. Пад купалам Сусвету.
8.40. Пяць хвілін на жарты.
8.45. Святочнае Велікоднае набажэнства ў Мінскім Саята-Духавым кафедральным саборы.
10.05. Канцэрт праваслаўнай духоўнай музыкі.
11.15. АВС-клуб.
11.30. Аэробіка.
12.05. Велікодныя дарункі "Тэлесябрыны".
14.55. І Рэспубліканскі тэлевізійны фестываль юных талентаў.
16.30. Велікодныя дарункі "Тэлесябрыны".
17.50. Грамадская думка.
18.35. Сляпае Аляксандр Салаўка.
20.25. Пяць хвілін на жарты.
20.30. Кантакт.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
21.45. "Чароўная музыка моды".
22.15. Спартыўны тэлекур'ер.
◆22.35. "ЖАП". 1-я серыя (Францыя).

Канал "Астанкіна"

8.15. Чэмпіянат свету па арыэнтыры "Залаты мядзведзь".
9.00. Палігон.
9.30. Добры дзень, Вялікдзень!
9.50. Таінства моды.
10.15. Новае пахаленне... Поспех.
10.50. Пад знакам "пі".
11.35. Маладыя гарады Расіі.
◆12.15. "Па закону джунглю". 2-я серыя.
13.20. Зорная гадзіна.
14.00, 20.00, 22.30. Навіны.
14.25. Я – жанчына.
◆14.55. "Сэрцы трох". Фільм 2-гі.
* 17.10. "Вяртанне ката Леапольда". 3-я і 4-я серыі.
17.40, 20.35. Надвор'е.
17.45. КВЗ-94.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.45. Маналог.
20.55. Хакей. Чэмпіянат свету.
23.30. Акадэмія. Забаўляльная праграма.

Канал "Расія"

8.15. Студыя "Рост".
8.45. Наш сад.
9.15. Лепшыя гульні НБА.
10.15. Сем нот у цішыні В.Малежык.
* 10.45. "Воўк і цяля".
◆10.55. "Абдулажон, ці Прысвячаецца Стывену Спілбергу".
12.20. Сусветная вёска.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.25. Кінарэйтынг-93.
14.15. "Дар мастака".
14.30. "Эрмітажны тэатр".
15.25. У свеце жывёл.
16.20. Выратаванне 911.
17.15. Саята кожны дзень.
17.25. Легенды і зоркі эстрады.
◆19.25. "А ці быў Каролін?" 2-я серыя.
20.35. "Маскі" ў оперы-2.
21.20. Момант Ісціны.
22.40. Аўтаімгненне.
22.45. Зоркі гавораць.
22.50. Спартыўная карусель.
◆22.55. "Мадэмуазель О".

Санкт-Пецярбург

◆8.00. Прарыв.
◆9.30. "На парозе ночы".
10.15. "Карэл Гот". Музычны фільм.
* 11.20. "Белы матылёк".
11.30. "Граф Люксембург". Аперэта Ф.Легара.
13.40. Студыя "Выбар" – праваслаўнае кіно.
◆14.25. "Зверабой" 1-я і 2-я серыі.
16.45. Вялікі фестываль.
17.00. Святочныя песнапенні ў выкананні ансамбля "Пеўчыя Расіі".
◆17.30. "На парозе ночы".
18.15. "Палац Марлі". Тэлефільм.
18.30. Інфарм ТБ.
◆18.55. "Іспанская актрыса для рускага міністра".
20.35. Ваш стыль.
20.45. "Без назвы".
21.05. Бенефіс А.Буйнова.
* 21.55. "Густаў". Частка 1-я.
22.05. "Тарцюф". Фільм-спектакль.

8-ы канал

18.00. Аб'явы. Рэклама.
◆18.05. "Карусель".
* "Добрасардэчная дзяўчынка".
◆18.30. "Ад'ютант яго праваскхадзіцельства". 1-я серыя.
19.40. "Скарбонка з сакрэтам".
◆19.50. "Хіл Стрым Блюз", "Вашынгтон сканаў."
20.40. Гарадскія гадзінікі.
20.50. "Камаедзіца". Фестываль сатыры і гумару.
◆21.40. "Лёс". 58-я серыя.
22.20. Ні слова пра...
◆22.30. "Неймавернае багацце" з серыі "Бацька Мэрфі".
23.30. Рэклама. Аб'явы.

3, аўторак

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Дзелавая хроніка.
8.20. Пад купалам Сусвету.
8.30. Пяць хвілін на жарты.
8.35. Фільм-канцэрт.
9.00. Тэлебачанне – школе. Мая радзіма – Беларусь.
◆9.20. "ЖАП". 1-я серыя.
11.05. АВС-клуб.
* 12.35. "Чарапашкі ніндзя".
13.10. Урокі здароўя.
13.30. Навіны.
14.50. Каралеўскае палаванне.
15.50. Тэлебачанне – школе. Аповесць Васіля Быкава "Жураўліны крык".
16.25. Для школьнікаў.
17.10. Навіны.
17.20. Да нацыянальнага свята Польшчы.
17.30. "Гета Варшава". Д/ф
18.00. Дзелавая хроніка.
18.10. Абласныя навіны (Вішебск).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Зачытайце маё пісьмо...
19.05. Стоп-кадр.
19.25. Мост.
19.55. Да 50-годдзя вызвалення Беларусі.
20.25. Пяць хвілін на жарты.
20.30. Кантакт.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
21.45. Рэклама.
◆21.55. "Семнаццаць імгненняў вясны". 4-я серыя.
23.10. Надвор'е.
23.20. Ніка.

Канал "Астанкіна"

8.15. На балі ў Паляўшкі.
9.15. Сіняя птушка Расіі.
10.00. "Треба выжыць". Д/ф.
10.35. Спартыўная гімнастыка. Чэмпіянат свету.
11.20. Пераадоленне.
11.50. Футбольная аіктарына ФІФА.
◆12.20. "Па закону джунглю". 3-я серыя.
13.30. Фестываль традыцыйных балявых мастацтваў. "Рускі стыль".
14.00, 20.00, 23.00. Навіны.
◆14.25. "Рынальда Рыкальдзіні – атаман рабоўнікаў".
14.50. Вагон бз.
15.30. Клуб падарожнікаў.
23.35. "Гран-пры" Рэспублікі Беларусь.

Канал "Астанкіна"

8.15. На балі ў Паляўшкі.
9.15. Сіняя птушка Расіі.
10.00. "Треба выжыць". Д/ф.
10.35. Спартыўная гімнастыка. Чэмпіянат свету.
11.20. Пераадоленне.
11.50. Футбольная аіктарына ФІФА.
◆12.20. "Па закону джунглю". 3-я серыя.
13.30. Фестываль традыцыйных балявых мастацтваў. "Рускі стыль".
14.00, 20.00, 23.00. Навіны.
◆14.25. "Рынальда Рыкальдзіні – атаман рабоўнікаў".
14.50. Вагон бз.
15.30. Клуб падарожнікаў.
◆18.20. "Гарачаў і іншыя".
17.00. Брэйн-рынг.
17.50, 20.35. Надвор'е.
17.55. Шырэй кругі.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.45. Бамонд.
◆21.00. "Тэрмінатар".
23.10. Чэмпіянат свету па кікбоксінгу сярод прафесіяналаў.

Канал "Расія"

◆8.30. "Кароль-Алень".
9.45. Непазнаны Сусвет.
10.15. На вякі вечныя.
10.35. Стырнавая кніга.
◆11.05. "Кранутыя".
12.40. Сялянскае пытанне.
13.20. Балет Санкт-Пецярбурга.
15.35. Прагулка па вуліцы Брыльянтаў.
18.15. Мне сніцца Ясная Паляна.
19.25. Падрабязнасці.
◆19.35. "Санта-Барбара".
20.25. Ніхто не забыты.
20.30. Бясшумныя лідэры.
* 21.00. "Пацалунак" і інш.
21.20. Правінцыяльныя пісьмы. "Саратаўскія інтэлігенты".
22.40. Аўтаімгненне.
22.45. Зоркі гавораць.
22.50. Спартыўная карусель.
22.55. Экран крымінальных паведамленняў.
23.05. Вячэрні салон.

Санкт-Пецярбург

◆9.30. "На парозе ночы".
10.15. Тэледактар.
◆10.30. "Глядзі весялей".
11.35. Канцэрт па заяўках.
12.05. "Ваня, як ты тут?"
12.30. "Усмешка". Цыркавая праграма.
12.50. "Скандальнае здаровне". Тэлеспектакль.
◆14.45. "Хітрыкі блізнятаў".
16.00. Казка за казкай.
16.45. Вялікі фестываль.
17.00. Ваша права.
◆17.30. "На парозе ночы".
18.15. "Погляд скрозь час. Самут і Мутнефрэт".
18.30. Інфарм ТБ.
18.55. Свет мастацтваў.
19.25. Лікі авангарду. Музычны дадатак да "Свету мастацтваў".
20.15. "Наўздагад".
20.35. Ваш стыль.
20.45. Ходаевай у Санкт-Пецярбургу.
21.30. Чэмпіянат Расіі па футболу.
* 22.15. "Густаў".
22.25. "Старасвецкія памешчыкі". Спектакль.
23.40. Еўрапейскі калейдаскоп.

8-ы канал

18.00. Аб'явы. Рэклама.
* 18.05. "Падарожжа Гулівера". 1-я частка. "Гавайскі трус".
◆18.35. "Ад'ютант яго праваскхадзіцельства". 2-я серыя.
19.55. Студыя "ІНТЭКС", "Навіны".
◆20.05. "Лабірынт правасуддзя", "Чый гэта лес?"
* 20.55. "Як мышы ката хавалі".
21.10. Сямейнае кола.
◆21.20. "Лёс". 57-я серыя.
22.20. Стрэс-паўза.
◆22.25. "Неатрыманая прэмія" з серыі "Махляры".
23.30. Рэклама. Аб'явы.

4, серада

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. Надвор'е.
8.30. Пяць хвілін на жарты.
8.35. "Дарогі кабаярскія". Фільм-канцэрт.
9.00. ТБ – школе. Аповесць Васіля Быкава "Жураўліны крык".
◆9.45. "Семнаццаць імгненняў вясны". 4-я серыя.
11.00. Аэробіка.
12.40. Тэлевізійны Дом кіно.
13.30. Навіны.
15.25. "Нов і К"-топ-10.
16.25. Паказвае тэлеканал "Уорлднет".
16.55. Асацыяцыя дзіцячай прэсы прадстаўляе.
17.30. Навіны.
17.40. Творчае аб'яднанне "Німіга-17".
18.05. Рэзерв.
18.10. Абласныя навіны (Гомель).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. "Пяць зорак".
20.00. Аўтамабільны рынак Беларусі.
20.30. Кантакт.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
21.45. Пяць хвілін на жарты.
21.50. Рэклама.
◆22.00. "Семнаццаць імгненняў вясны". 5-я серыя.
23.15. "Дзесяць хвілін плюс стагоддзе".
23.25. Надвор'е.
23.35. Ніка.
23.50. "Мінск-94". І Міжнародны джазавы фестываль.

Канал "Астанкіна"

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 22.30. Навіны.
8.20. Сарока. Дзіцячая інфармацыйная праграма.
◆8.40. "Пецярбургскія тайны".
9.40. Клуб падарожнікаў.
10.30. Джэм.
14.25. Прадпрымальнік.
* 15.20. "Прыгоды Тома Соера".
15.50. Джэм.
16.20. Адказы.
16.50. Загадка СБ.
17.25. Тэлерадыёкампанія "Мір".
17.50, 20.35. Надвор'е.
◆17.55. "Пецярбургскія тайны".
18.55. Тома.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.45. Маналог.
20.55. Хакей. Чэмпіянат свету.
23.30. Праграма "Х".

Канал "Расія"

8.00. Сусветныя навіны Эй-бі-сі.
8.30. Некалькі радкоў пра каханне...
8.45. Момант Ісціны.
9.40. Сялянскае пытанне.
15.20. Студыя "Рост".
15.50. Там-там навіны.
16.05. Тэлегазета.
16.15. Далёкі Усход.
17.00. Здарова жывеш.
17.15. Прыватная калекцыя.
17.45. Свята кожны дзень.
17.55. Не быць дыназаўрам.
18.10. L-клуб.
19.25. Падрабязнасці.
◆19.35. "Санта-Барбара".
20.25. Рэпарцёр.
20.40. Вялікі скандал. "Усё на продаж?".
21.15. 60 мінут. Праграма Сі-бі-эс і Расійскага ТБ.
22.40. Аўтаімгненне.

Да ўвагі абітурыентаў-94!

Выдавецтва «Тры В» распаўсюджвае па пошце «Даведнік па беларускай мове для абітурыентаў ВНУ» з дзвюх частак.

Цана камплекта (з улікам паштовых расходаў) — 7000 рублёў.

Аплата па пошце па адрасу:

4000, г.Брэст, а/с 31, разліковы рахунак 644303 у Маскоўскім аддзяленні АК Прамбудбанка г.Брэста.Код банка 150501312.

З пометкай: для МП «Тры В».

Жадаем поспеху!

5, чацвер

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. Надвор'е.
8.30. Пяць хвілін на жарты.
8.35. Фільм-канцэрт.
◆9.05. "Семнаццаць імгненняў вясны". 5-я серыя.
10.20. Да 50-годдзя вызвалення Беларусі.
12.15. "Дзесяць мінут плюс стагоддзе".
12.25. "Пранясі, Божа, хмару".
13.30. Навіны.
15.00. Відзьма-нявідзьма.
16.00. Мы такія розныя.
17.00. ТБ – школе. Пятрусь Броўка і яго паэзія.
17.30. Навіны.
17.40. Тэлеклуб "Пошук".
18.10. Абласныя навіны (Гродна).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Зачытайце маё пісьмо...
19.05. Гаспадар.
19.40. Дзелавая размова.
20.10. Пазіцыя ўрада.
20.25. Пяць хвілін на жарты.
20.30. Кантакт.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
21.45. Рэклама.
◆21.55. "Семнаццаць імгненняў вясны". 6-я серыя.
23.10. Надвор'е.
23.20. Ніка.
23.30. "Крок".

Канал "Астанкіна"

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 22.30. Навіны.
8.20. Паглядзі, паслухай...
◆8.45. "Пецярбургскія тайны".
9.45. У свеце жывёл.
10.20. ...Да 16 і старэйшым.
11.20. Госці з'язджаліся на дачу...
14.25. Прадпрымальнік.
15.05. Як дабіцца поспеху.
* 15.20. "Прыгоды Тома Соера".
15.50. Спяваюць заронажскія дзяўчаты.
16.10. ...Да 16 і старэйшым.
16.50. Тэхнадром.
17.25. За кулісамі. Згода ў Расіі і Садружнасць.
17.45. Дакументы і лёсы.
17.50, 20.35. Надвор'е.
◆17.55. "Пецярбургскія тайны".
18.55. Аўтарская праграма Ю.Нагібіна.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.45. Лато "Мільён".
20.55. Хакей. Чэмпіянат свету.
23.30. Бумеранг.

Канал "Расія"

8.00. Сусветныя навіны Эй-бі-сі.
* 8.30. Мульці-пульці.
8.35. Паехалі.
◆8.45. "Санта-Барбара".
9.35. Тэлегазета.
9.40. Сялянскае пытанне.
◆10.10. "Санта-Барбара".
15.20. "Дзень добры, Камчатка!". Д/ф.
15.30. Прыгоды ваўчара.
15.50. Там-там навіны.
16.05. Новая лінія. "Ствары даброе...".
* 16.50. "Чалавек мацней за крэпасць".
17.00. Будні.
17.30. Панове-таварышы.
17.45. Свята кожны дзень.
17.55. У свеце аўта- і мотаспорту.
18.25. Свая гульня.
19.25. Падрабязнасці.
◆19.35. "Санта-Барбара".
20.25. Ніхто не забыты.
20.30. Бясшумныя лідэры.
* 21.00. "Пацалунак" і інш.
21.20. Правінцыяльныя пісьмы. "Саратаўскія інтэлігенты".
22.40. Аўтаімгненне.
22.45. Зоркі гавораць.
22.50. Спартыўная карусель.
22.55. Экран крымінальных паведамленняў.
23.05. Вячэрні салон.

Санкт-Пецярбург

◆9.30. "На парозе ночы".
10.15. Тэледактар.
◆10.30. "Глядзі весялей".
11.35. Канцэрт па заяўках.
12.05. "Ваня, як ты тут?"
12.30. "Усмешка". Цыркавая праграма.
12.50. "Скандальнае здаровне". Тэлеспектакль.
◆14.45. "Хітрыкі блізнятаў".
16.00. Казка за казкай.
16.45. Вялікі фестываль.
17.00. Ваша права.
◆17.30. "На парозе ночы".
18.15. "Погляд скрозь час. Самут і Мутнефрэт".
18.30. Інфарм ТБ.
18.55. Свет мастацтваў.
19.25. Лікі авангарду. Музычны дадатак да "Свету мастацтваў".
20.15. "Наўздагад".
20.35. Ваш стыль.
20.45. Ходаевай у Санкт-Пецярбургу.
21.30. Чэмпіянат Расіі па футболу.
* 22.15. "Густаў".
22.25. "Старасвецкія памешчыкі". Спектакль.
23.40. Еўрапейскі калейдаскоп.

8-ы канал

18.00. Аб'явы. Рэклама.
* 18.05. "Падарожжа Гулівера". 1-я частка. "Гавайскі трус".
◆18.35. "Ад'ютант яго праваскхадзіцельства". 2-я серыя.
19.55. Студыя "ІНТЭКС", "Навіны".
◆20.05. "Лабірынт правасуддзя", "Кот і мышка".
20.40."Навіны", ММ-4.
21.10. "Фаўт". Кікбоксінг.
◆20.55. "Лёс". 59-я серыя.
21.55. Сямейнае кола.
◆22.05. "Сустракайце доктара Хрысціяна".
23.30. Рэклама. Аб'явы.

6, пятніца

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Дзелавая хроніка.
8.20. Пад купалам Сусвету.
8.30. Надвор'е.
8.40. Пяць хвілін на жарты.
8.45. "Драўляныя рамёствы". Кінанарыс.
9.00. ТБ – школе. Пятрусь Броўка і яго паэзія.
9.30. Рэклама.
◆9.40. "Семнаццаць імгненняў вясны". 6-я серыя.
10.55. "Пяць зорак".
11.55. "Сляпае Муслім Магамаеў".
12.40. Студыя "Тэлесябрыны".
13.15. Пазіцыя ўрада.
13.30. Навіны.
15.40. Еўрапейскі калейдаскоп.
16.10. Да 50-годдзя вызвалення Беларусі.
16.50. Пятлярая аўтаграфаў.
17.30. Навіны.
17.40. Выступленне паэта-фрэмаліка Пятра Прыходзькі.
18.00. Дзелавая хроніка.
18.10. Абласныя навіны (Магілёў).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Футбол. Чэмпіянат Беларусі.
19.50. "Так гета было...". Расказвае Мікалай Прохаравіч Чайка, былы танкіст.
20.10. Студыя "Тэлесябрыны".
20.25. Пяць хвілін на жарты.
20.30. Кантакт.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
◆21.45. "Шура і Прасвіряк".
23.15. Надвор'е.
23.25. Рэйтынг.
23.40. Ніка.
23.56. І Міжнародны джазавы фестываль.

Канал "Астанкіна"

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 23.00. Навіны.
* 8.20. "Эх, Таптыгін, Таптыгін".
◆8.30. "Птушынае малако".
9.30. Футбол. На шляху да Узмблі.
10.30. Творчасць народаў свету.
14.25. Дзелавая хроніка.
14.35. Брыдж.
14.55. Бізнес-клас.
◆15.10. "Птушынае малако".
16.10. Ты поміш, таварыш...
16.50. Азбука ўласніка.
17.25. Навіны культуры.
17.40. Чалавек і закон.
18.10, 20.35. Надвор'е.
18.15. Японія з А.Калошыным.
18.45. Поле цудаў.
19.40. Добрай ночы, малышы!
◆20.45. "Дэн Огаст" (ЗША). Фільм 2-гі.
21.45. Чалавек тыдня.
22.05. Святочны мікрафон.
23.45. Музагляд.
0.25. Аўта-шоу.

Канал "Расія"

8.00. Сусветныя навіны Эй-бі-сі.
* 8.30. "Як Нічачка царыцай стала".
8.40. Паехалі.
◆8.50. "Санта-Барбара".
9.40. Сялянскае пытанне.
15.20. Студыя "Рост".
15.50. Там-там навіны.
16.05. Ваенны кур'ер.
16.20. Новая лінія. "Вострай".
◆16.50. "Дзеці, якія вельмі многа ведалі". 1-я серыя.
17.45. Тэлегазета.
17.50. Свята кожны дзень.
18.00. "К-2" прадстаўляе: "Фрак народа".
19.25. Падрабязнасці.
◆19.35. "Вострай скарбаў" (Францыя–ЗША).
21.50. Я – лідэр.
22.40. Аўтаімгненне.
22.45. Зоркі гавораць.
22.50. Спартыўная карусель.
22.55. Футбол. 1/2 фіналу Кубка Расіі.
0.40. Клуб "Жоўтая падводная лодка".

Санкт-Пецярбург

8.25. Па сакрэту ўсяму свету.
8.35. Дзецям пра зверанят.
* 8.50. "Разумны сабачка Соня".
9.00. Нямецкая хваля.
◆9.30. "На парозе ночы".
10.15, 11.55, 14.40. Музычны момант.
10.30. Хуткая дапамога.
11.00. "Серэбраная ніць". Праграма для пажылых людзей.
11.30, 14.30, 18.30, 21.45. Інфарм ТБ.
11.40. Урок нямецкай мовы.
12.00. "Наўздагад".
◆12.20. "Вандроўны аўтобус".
◆14.10. "У мяне ў кішэні".
14.45. "Кашчэй Бессмяротны". Тэлефільм.
15.55. Залаты ключ.
16.05. Кідайка.
18.45. Вялікі фестываль.
* 17.00. Новы Пецярбург.
◆17.30. "На парозе ночы".
* 18.15. "Хто самы дужы".
18.50. Спорт, спорт, спорт...
19.05. Будні.
19.20. Тэл